Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СТУДЗЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 2 (27367) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Праваслаўным хрысціянам Беларусі

*Дарагія суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас са светлым святам Нараджэння Хрыстовага.*

*На працягу больш чым двух тысячагоддзяў мільёны людзей з радасцю і надзеяй звяртаюць свае думкі да гэтай падзеі, якая стала пераломным момантам у духоўным жыцці чалавецтва. Евангельскія ідэалы служаць для нас непарушным маральным законам, які пабуджае здзяйсняць велікадушныя ўчынкі іператвараць навакольны свет.*

*Раство невыпадкова з'яўляецца адным з самых любімых свят на беларускай зямлі. Бо Праваслаўная царква заўсёды была разам з народам, адыграла важную ролю ў станаўленні дзяржаўнасці і фарміраванні характару беларусаў. І сёння яна з'яўляецца нашым надзейным памочнікам у сацыяльным служэнні, справах міласэрнасці і асветы.*

*Няхай жа гэтыя цудоўныя зімовыя дні прынясуць у вашы дамы і сем'і згоду і ўзаемаразуменне, дастатак, словы кахання і дзіцячы смех. Няхай ззянне калядных зорак увесь год натхняе вас на добрыя справы і стваральную працу ў імя роднай Беларусі.*

*Здароўя, радасці, поспехаў і шчасця вам, дарагія сябры.*

*З Раством!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## І СВЯТЛО КАЛЯДНАЙ ЗОРКІ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПЕНСІІ ЗА 7 СТУДЗЕНЯ БУДУЦЬ ВЫПЛАЧАНЫ ДАТЭРМІНОВА

**У краіне графік выплаты пенсій скарэкціраваны ў сувязі з Калядамі, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў РУП «Белпошта».**

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 7 студзеня 2013 года пачалася з 4 студзеня ў сельскіх аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай вобласці, а таксама ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Віцебскай вобласці, Магілёва і Мінска.

Выплата пенсії ў астатніх аддзяленнях паштовай сувязі рэспублікі пачнецца з 5 студзеня. Як праінфармавалі ў РУП «Белпошта», 6 і 7 студзеня будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі.

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +1° |
| Віцебск | –2° |
| Гомель | –1° |
| Гродна | 0° |
| Магілёў | –3° |
| Мінск | 0° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.01.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8630,00 | ▲ |
| Еўра | 11230,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 284,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1073,38 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

## Пасланне на Раство Хрыстова Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

***Узлюбленыя ў Госпадзе архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!***

*Раство Тваё, Хрысце Божа наш, азарыла свет святлом ісціны...*

**Трапар Раства Хрыстовага**

Сёння нашы сэрцы азораны радасцю аб уцялесненым Сыне Божым. Святло ісціны — Бог наш Ісус Хрыстос — ззяе ўсяму свету праменнямі Каляднай зоркі. Яго ўсхваляюць Сілы Нябесныя, Яму пакланяецца прыгажосць зямлі. Мора ўбачыла і пабегла; Іардан павярнуўся назад (Пс. 113: 3), — такім убачыў прарок лікаванне прыроды, якая сустракае нованароджанае Богадзіця.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Разумеючы гэтае сапраўды сусветнае значэнне ўцялеснення Бога, мы ўсведамляем, што яно звернута да кожнага з нас. Ад валхва, носьбіта ўлады і ведаў, да сціплага пастуха — кожны закліканы пачуць Добрую вестку. І гэта таму, што сэрца чалавека — аснова, на якой трымаецца добраўладкаванне свету і з якой, наадварот, пачынаецца яго разбурэнне.

Гасподзь стварыў нас паводле Вобраза Свайго, каб мы былі падобнымі да Яго. Але цуд тварэння чалавека заключаецца ў тым, што Бог дае нам магчымасць самім вызначыцца: жадаем мы ісці да богападабенства ці не. Свабода — гэта найвялікшы дар, але і нялёгкі цяжар для тых, хто не гатовы зразумець яе як умову любові.

Уцялесненне Хрыста, Сына Божага, — свабоднае дзеянне любячага Бога. І яго сэнс — аднавіць свабоду чалавека ў зваротнай любові.

Евангеліст Лука апавядае, як Святое Сямейства, выйшаўшы з Назарэта для ўдзелу ў перапісе, шукае прытулку ў Віфлееме. І мы бачым за гэтым апісаннем, як Гасподзь шукае месца, каб явіць Сябе. Але ўсе віфлеемскія дамы аказваюцца занятымі.

Што можа быць больш красамоўным? Дамы і пакоі, якія з'яўляюцца вобразамі чалавечай душы, запоўнены. І не так ужо і важна — хто пасяліўся там, якімі думкамі і пачуццямі запоўнены душы, калі ў іх не знаходзіцца месца для Творцы.

Але вось цуд міласэрнасці Божай! Абраўшы Сабе Маці — пакорлівую Дзеву, — Ён не грэбуе быць народжаным у вярцепе, у звычайным загоне для жывёлы. Нават калі род чалавечы не гатовы да ўрачыстай сустрэчы Бога, Ён усё роўна прыйдзе, убраны ў лагоднасць і пакору! «Тайна нарадзіўся Ты ў пячоры, — сведчыць Царква і адразу ж дадае: — Але неба пра Цябе ўсім абвясціла» (вялікая вячэрня, трапар, глас 6).

СТАР. 3

## АДКРЫЎСЯ МІЖНАРОДНЫ КАЛЯДНЫ ТУРНІР АМАТАРАЎ ХАКЕЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 студзеня ўзяў удзел у адкрыцці IX Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

За галоўны прыз турніру пазмагаюцца каманды аматараў хакея з Расіі, Аўстрыі, Славакіі, Германіі, Чэхіі, Канады, Швейцарыі і Беларусі. На папярэднім этапе ўдзельнікі падзелены на дзве групы. У квартэт А ўключаны каманда Прэзідэнта Беларусі, дружыны Чэхіі, Канады і Швейцарыі. Матчы гэтай чацвёркі пройдуць у Палацы спорту. У групу В увайшлі каманды Расіі, Аўстрыі, Славакіі і Германіі. Яны правядуць свае матчы ў Лядовым палацы на вуліцы Прытыцкага.

Учора вечарам каманда Прэзідэнта Беларусі згуляла з дружынай Швейцарыі. 5 студзеня беларусы сустракаюцца з Канадай, 6 студзеня — з Чэхіяй.

Пасля завяршэння аднакругавых групавых турніраў удзельнікі разыграюць прызавыя месцы. На лёдзе «Мінск-Арэны» 7 студзеня пераможцы папярэдніх квартэтаў паспрачаюцца за галоўны трафей, а каманды, якія занялі другія месцы, згуляюць за бронзу. Мінулыя гады пераможцам Каляднага турніру шэсць разоў станавілася каманда Прэзідэнта Беларусі (у 2005, 2006, 2008, 2009, 2010 і 2012 гадах). Двойчы поспех святкавала расійская дружына.

Учора ўнічыю завяршыліся два першыя матчы турніру — Канада — Чэхія — 2:2 і Германія — Славакія — 3:3.

Фота БЕЛТА.



**Гуляюць Канада і Чэхія.**

## Ветэранам і работнікам сістэмы працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў сацыяльнай абароны.

Развіццё і працвітанне краіны немагчыма ўявіць без эфектыўнай сістэмы працаўладкавання і дапамогі найбольш неабароненым слаям насельніцтва.

Ваша праца заслужыла ўсеагульнае прызнанне, бо дзякуючы вашым намаганням жыццё многіх людзей напоўнілася сэнсам і набыло надзею.

Прадстаўнікі вашай прафесіі ўвасабляюць лепшыя чалавечыя якасці — міласэрнасць, спачуванне, уменне суперажываць. Дзень пры дні вы дорыце спагаду і душэўную цеплыню тым, хто мае патрэбу ў клопаце і падтрымцы.

Захоўвайце вернасць свайму высокаму прызванню, і няхай яно прынясе вам радасць і заслужаную павагу.

Жадаю ўсім ветэранам і работнікам сістэмы працы і сацыяльнай абароны моцнага здароўя, шчасця і поспехаў у такой высакароднай і неабходнай справе.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## Беларусь мае намер выкарыстоўваць старшынства ў СНД для ўмацавання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзяржаў Садружнасці

**Аб гэтым гаворыцца ў звароце Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Рэспубліка Беларусь 1 студзеня 2013 года ўступіла ў старшынства ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Наша краіна разглядае Садружнасць у якасці важнага інтэграцыйнага аб'яднання на постсавецкай прасторы, што садзейнічае забеспячэнню эканамічнай і сацыяльнай стабільнасці ў рэгіёне, — адзначыў Прэзідэнт. — Жыццяздольнасць і запатрабаванасць шматбаковага супрацоўніцтва ў Садружнасці абумоўлены прадстаўленай кожнай дзяржаве магчымасцю выбару прымальнага фармату свайго ўдзелу ў ёй».

«Рэспубліка Беларусь заўсёды падтрымлівала цэнтраімклівыя тэндэнцыі на постсавецкай прасторы, адказна падыходзіла да сваёй ролі ў кансалідацыйных працэсах у рамках Садружнасці і мае намер выкарыстоўваць сваё старшынства для далейшага ўмацавання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, павышэння ўзроўню жыцця і дабрабыту іх грамадзян, а таксама захавання і прымнажэння пазітыўнага вопыту інтэграцыйнага ўзаемадзеяння, набытага ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў», — гаворыцца ў звароце.

Беларускае старшынства пройдзе пад дэвізам «Інтэграцыя на карысць чалавека: умацаванне добрасуседства, развіццё экалагічнага супрацоўніцтва, садзейнічанне павышэнню даступнасці экалагічных «зялёных» тэхналогій, пашырэнне дыялогу культур».

Рэспубліка Беларусь будзе кіравацца Канцэпцыяй свайго старшынства ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў у 2013 годзе і Планам мерапрыемстваў па яе рэалізацыі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею на падтрымку з боку дзяржаў — удзельніц Садружнасці ў практычным ажыццяўленні беларускіх ініцыятыў. «Перакананы, што цеснае ўзаемадзеянне ўсіх краін СНД стане залогам максімальна эфектыўнай рэалізацыі намечаных планаў у інтарэсах нашых народаў і ўмацавання іміджу Садружнасці Незалежных Дзяржаў», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

## А.Дазораў вызвалены ад пасады першага намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім указам вызваліў Анатоля Дазорава ад пасады першага намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі, паведамілі БелТА ў прэс-службе Прэзідэнта.





## Да свята Божага Нараджэння

Падыходзіць да завяршэння чарговая праваслаўная выстава-кірмаш «Раство Хрыстова». Сёлета пад яе правядзенне была адведзена выставачная прастора сталічнага Палаца мастацтваў. Удзельнікамі каляднага кірмашу сталі амаль сто прадстаўнікоў з Беларусі, Расіі, Малдовы і Украіны. Манастырскія майстэрні і царкоўныя прыходскія лаўкі прывезлі ў Мінск духоўную літаратуру, старажытныя іконы, царкоўнае начынне і безліч цікавых сувеніраў, без якіх немагчыма ўявіць свята Божага Нараджэння.



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Пенсіі пакуль павышацца не будуць

**Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.**

Пенсіі з 1 лютага ў Беларусі павышацца не будуць. Праект указа аб павышэнні пенсій з гэтай даты не рыхтуецца», — сказаў Валерый Кавалькоў. Гэта звязана з тым, што, як чакаецца, устаноўлены заканадаўствам крытэрый для павышэння працоўных пенсій (рост сярэдняй заработнай платы на 15% да паказчыка сярэдняй заработнай платы, прынятай для вылічэнняў пенсій) не будзе перавышаны.

***У Беларусі на фінансаванне пенсійных выплат накіроўваецца 10% ВУП. Пенсіянерамі на сённяшні дзень з'яўляюцца больш за 27% насельніцтва краіны.***

Паводле слоў намесніка міністра, у 2012 годзе ў Беларусі былі зроблены 4 пераразлікі пенсій, што дазволіла павялічыць іх узровень на 24%. «Яны ў мінулым годзе раслі хутчэй, чым заработная плата», — сказаў Валерый Кавалькоў.

Разам з тым, у сувязі з ростам бюджэту пражытачнага мінімуму з лютага могуць быць пераразлічаны мінімальныя сацыяльныя пенсіі, а таксама павышэнні і надбаўкі, устаноўленыя да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў.

**Святлана БУСЬКО.**

## Пацярпелі ад піратэхнікі

Пры выкарыстанні піратэхнікі ў навагоднюю ноч атрымалі траўмы 11 чалавек. Сярод пацярпелых было трое дзяцей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПАРТЫЗАНСКАГА НОВАГА ГОДА

**Уявіце сабе: вечарам, каб трапіць на партызанскае навагодняе свята, якое адбылося ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М.Ф. Шмырова, пасля набыцця квіткоў трэба было паказаць іх «фашыстам». Апошнія «дзяжурылі на КПП» каля ўвахода на музейную пляцоўку пад адкрытым небам. Людзі, якія пра гэта не ведалі, верагодна, думалі, што здымаюць кіно, або ім здавалася, што машына часу перанесла гараджан у гады вайны.**




«Немцы», як і партызаны, — гэта члены клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Таварышы па зброі». Іх ужо здымалі ў сапраўдным кіно...

На тэрыторыі паркавай зоны музея літаральна саграваала сэрцаназіранне таго, як партызаны распальвалі вогнішча, варылі на ім у вялікім катле кашу, а потым — бульбу.

Хлопцы ў форме партызан і немцаў, поўнасцю ідэнтычнай сапраўднай, паказалі, як першыя напалі на фашыстаў у цёмным лесе. Потым партызаны «дапытвалі» ў бліндажы «языка», якога «ўзялі ў палон». Фашысты, каб «адпомсціць» партызанам, паспрабавалі «захапіць іх у палон», нават стралялі з мінамёта. Але партызаны ўсё роўна іх перамаглі!..

Усе наведвальнікі паспрабавалі шчасця ў бясплатнай «партызанскай» латарэі. Каму дасталіся запалкі, а шчаслiўчыку — буханка хлеба. Таксама было прапанавана паўдзельнічаць у аўкцыёне па продажы «партызанскіх» сувеніраў. Дазволілі пастраляць шарыкамі з фарбай у мішэнь. Гасцям свята паказалі бліндажы партызан, упрыгожаныя ёлкамі. Вялікі інтарэс выклікала выстава навагодніх плакатаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Свята завяршылася сяброўскай вячэрай. Смачныя каша і бульба, прыгатаваныя на вогнішчы, прыйшліся даспадобы. Асабліва прыемна было піць гарбату (на жаль, не «партызанскую», а звычайную, у пакетах. — **А.П.**), каб сагрэцца ў халодным бліндажы. Фота на памяць з актывістамі клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі было яшчэ адным сюрпрызам для наведвальнікаў музея.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НОВЫ ГОД — НОВАЕ ПАЛЯВАННЕ

Згодна з правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне з пачатку месяца стартаваў чарговы сезон палявання — на высакароднага аленя, еўрапейскую лань, плямістага аленя.

Дарослых самцоў, селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту дазваляецца здабываць зброевым спосабам з засады з вышак па 31 студзеня цягам сутак.

Таксама з пачатку студзеня распачаўся і сезон палявання на дзіка. Да здабычы зброевым спосабам з засады з вышак дазволены дарослыя самцы, маладняк да двух гадоў любога полу і ўзросту. Гэты сезон палявання будзе доўжыцца па 30 красавіка цягам сутак.

## ПРАЕЗД ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ ДАРАЖЭЕ

З 5 студзеня праезд у паяздах унутраных зносін у Беларусі павялічваецца ў сярэднім на 17%. Такое падаражанне тарыфаў на перавозкі пасажыраў чыгуначным транспартам на гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных лініях прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі № 90 ад 26 кастрычніка 2012 года.

Кошт праезду пасажыраў паяздамі на гарадскіх лініях павялічыцца ў межах тарыфнага пояса з 3 тысяч рублёў да 3,5 тысячы. Пры праездзе з аднаго тарыфнага пояса ў другі кошт зменіцца зараз з 4 тысяч рублёў да 4,7 тысячы. Кошт праезду за адзін кіламетр паяздамі эканом-класа на рэгіянальных лініях павялічыцца з 60 да 70 рублёў, за адну зону, адпаведна, з 600 да 700 рублёў. Пастанова Мінэканомікі прынята на падставе прапаноў Беларускай чыгункі — у прыватнасці, у мэтах скарачэння стратнасці пасажырскіх перавозак чыгуначным транспартам агульнага карыстання ўнутры краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗАГІНУЎ 41 АЛЕНЬ

У вальеры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў у Докшыцкім раёне каля вёскі Камайск загінуў 41 алень еўрапейскі.

— На месца здарэння выязджала група Докшыцкага раённага аддзела ўнутраных спраў, прадстаўнікі Бягомльскай міжраённай інспекцыі па ахове жывёльнага і раслiннага свету і раённай ветэрынарнай службы. Прадстаўнікамі ветэрынарнай службы былі адабраны неабходныя ўзоры (фрагменты туш загінулых жывёл, кармы, невядомае рэчыва, параскіданае на тэрыторыі вальера), якія адпраўлены для далейшага правядзення аналізаў у Докшыцкім раёне і абласную ветэрынарную станцыю, — паведамілі ў Віцебскім абласным Камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

У цяперашні час праведзена экспертыза кармоў на наяўнасць нітрытаў і нітратаў. Даныя аб перавышэнні вышэйназваных рэчываў адмоўныя. У бліжэйшы час будуць скончаны даследаванні на вірусы і бактэрыяльныя інфекцыі. Летась падчас праверак аб стане жывёл, якія знаходзяцца ў вальеры, парушэнняў не было ўстаноўлена. Вальер быў пабудаваны ў 2010 годзе, яго плошча — 44 га. Усяго ў вальеры змяшчалася 71 асобіна жывёл.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Па чутках і аўтарытэтна

## СМС-ПРАВАКАЦЫЯ

**Распаўсюджаныя ўчора ў сацыяльных сетках фатаграфіі СМС-паведамлення, нібыта атрыманага ад кантакт-цэнтра Нацыянальнага банка, аб маючым адбыцца 8 студзеня рэзкім росце курсаў долара і еўра, з'яўляюцца адкрытай правакацыяй і не маюць нічога агульнага з рэчаіснасцю. Аб гэтым БЕЛТА заявіў начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка Аляксандр Цімашэнка.**

Па-першае, у якасці тэлефона адпраўніка ўказаны нумар гарадскога стацыянарнага тэлефона, з якога адправіць СМС тэхнічна немагчыма, звярнуў увагу прадстаўнік Нацбанка. Па-другое, курсы еўра і долара на 8 студзеня ўжо ўстаноўлены па выніках біржавых таргоў, якія адбыліся ў пятніцу 4 студзеня (курс еўра ўсталяваўся на ўзроўні Br11230, курс долара — Br8630). Паколькі ў сувязі з выхаднымі днямі 5-7 студзеня біржавыя таргі праводзіцца не будуць, то і курс за гэты час змяніцца не зможа.

«Таму цалкам відавочна, што распаўсюджванне СМС-«вуткі» з'яўляецца спробай сапсаваць беларусам свята, правакуючы іх правесці выхадныя ў чэргах у пункты абмену валюты», — канстатаваў Аляксандр Цімашэнка.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў 2013 годзе Нацыянальны банк працягне рэалізацыю курсавой палітыкі, ключавыя прынцыпы якой дзейнічалі ў 2012 годзе. Абменны курс беларускага рубля будзе фарміравацца зыходзячы з попыту і прапановы замежнай валюты пры мінімальным удзеле Нацыянальнага банка ў гэтым працэсе выключна для недапушчэння рэзкіх ваганняў.

Так, пры павышаным попыце на замежную валюту курс зніжаецца, а пры залішняй прапанове беларускі рубель умацоўваецца. «Такая зменлівасць курсу адлюстроўвае толькі рынкавы механізм яго фарміравання, але не сведчыць аб наяўнасці прычын для ўстойлівага руху абменнага курсу ў той ці іншы бок», — звярнуў увагу Аляксандр Цімашэнка. Стабільнасць функцыянавання валютнага рынку і абменнага курсу ў вызначальнай ступені будзе залежаць ад збалансаванасці і эфектыўнасці працы ўсёй эканомікі, дадаў прадстаўнік Нацбанка.

# Пасланне на Раства Хрыстова Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Богаўцялесненне асвячае пячору нашага ўнутранага свету, стваараючы з яе царскія харомы. Як пяецца на святочным богаслужэнні: «Настаў час нарадзіць, і не было нідзе месца для начлегу; але, як харам прыветны, пячора Царыцы была паказана» *(трапар шостай гадзіны навячэр'я Раства Хрыстовага)*.

Любоў Бога, даходзячы да крайняй пакоры, чакае ад чалавека кроку ў адказ. Але, звяртаючыся да сведчання евангеліста Матфея, мы высвятляем, што Раства Хрыстова не ўсім прынесла радасць. Рэўнасць і зайздрасць, народжаныя ганарлівасцю, не дазволілі прыняць Добрую вестку цару Іраду. Больш за тое, ён імкнецца зрабіць усё, каб не дапусціць уваходжання Бога ў гістарычную плоць свету, — Ірад загадвае забіць усіх немаўлят, народжаных у Віфлееме.

Чаму ж сэрца чалавека так па-рознаму рэагуе на яўленне Святла, на прыход у свет Творцы? У аскетычнай літаратуры сілы нашай душы часам параўноўваюцца з жывёламі. Вол і асёл з Віфлеемскай пячоры, якіх мы бачым на іконах, пакорліва прызналі ў Богагадзіцы свайго Гаспадара. Але мы ведаем таксама пра аспіда і васіліска *(гл. Пс. 90: 13)*, якія жывуць у сэрцы чалавека. Менавіта пра іх у Пісанні гаворыцца: з сэрца выходзяць злыя помыслы, забойствы, пралюбадзействы, блуд, крадзяжы, ілжывыя сведчанні, блюзнерствы *(Мф. 15: 19)*.

Таму, стоячы сёння перад яслямі Хрыста, нам трэба разгледзець рухі ўласнага сэрца. Што ў ім: пакорнасць ці нараканне, услаўленне ці прыкрасць, падзяка ці жаданне абразіць блізкага?

Многія мудрацы спрабавалі аблегчыць чалавеку гэты страшны цяжар выбару, падказваючы і тлумачачы неабходнасць трымацца дабра. Але наша сэрца ведае: сапраўдны выбар заўсёды адбываецца ў адзіноце, і за нас яго не здзейсніць ніхто іншы. Сацыяльны статус не здымае адказнасці за прынятыя рашэнні, роўна як і адсутнасць статусу не апраўдвае нерашучасці і пасіўнасці перад абліччам зла.

Сёлета ва ўсім свеце будзе адзначана 1700-годдзе рашэння, якое сапраўды змяніла ход гісторыі. У 313 годзе імператар Канстанцін выдаў знакаміты Міланскі эдыкт, пасля гэтага пачалося паступовае станаўленне хрысціянства ў якасці дамінуючай рэлігіі Рымскай імперыі. Гэтае рашэнне было прынята невыпадкова: яно ажыццявілася на фоне і пад уздзеяннем пэўных палітычных, эканамічных, грамадскіх абставін. Але Царква ўбачыла, што ўсе грані гэтага рашэння былі асвячоны асабістай вернасцю імператара Хрысту, і менавіта таму праславіла Канстанціна ў ліку святых.

Гады ішлі, і разам з несумненнымі дабротамі, прынесенымі Царкве Міланскім эдыктам, стала відавочна, што ў асяроддзі хрысціян вера пачала паступова астываць. Хрысціянства выбіралі не толькі як шлях спасення, але і як знак лаяльнасці да ўлад, дзеля доступу да дзяржаўных прывілеяў.

Дарагія браты і сёстры! Кнігу гісторыі пішуць чалавечыя сэрцы. І тое, што адбылася 1700 гадоў таму, адбываецца і ў нашы дні.

Дзякаваць Богу, у Беларусі добрыя адносіны паміж дзяржавай і Царквой. Мы развіваем супрацоўніцтва, будуючы адносіны на грунце маральных каштоўнасцяў. Але сёння важна памятаць, што хрысціянства мае справу не толькі з супольнасцямі людзей: яно звернута да кожнай асобы. Гасподзь чакае ад нас рашэння: ці ўпусцім мы Яго ў наша сэрца, ці яно будзе занята клопатамі веку гэтага. Ці ёсць у нас золата веры, ладан малітвы і смірна пакаяння *(гл. Мф. 2: 11)*, каб дастойна сустрэць Творцу?

На гэтыя пытанні кожны адказвае сам. Але сёння хочацца ўсіх заклікаць пакланіцца Хрысту, каб плады Яго любові адчуваліся ў кожным доме, у кожнай сям'і. Вось гэтыя плады: любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, добрасць, міласэрнасць, вера, лагоднасць, устрыманасць *(Гал. 5: 22, 23)*.

Кожны чалавек хоча любіць і быць любімым. Няхай жа гэтыя святыя дні Нараджэння Гоcпада ў плоці стануць для нас нагодай падзяліцца багаццем нашых душ з блізкімі. Няхай Віфлеемская зорка пакажа кожнаму з нас шлях да сэрцаў нашых родных і калег, нашых суседзяў, сяброў і ворагаў, бо там, у сэрцы, — Хрыстос Бог наш. Пакінем ранейшыя крыўды і горыч і накіруемся ў будучыню. Бо з намі Бог. Яму належаць і час, і прастора. Дзе Дух Яго любові, там і дом наш.

Яшчэ і яшчэ вітаю вас, дарагія беларусы, якія жывуць за межамі Айчыны, і жадаю вам адчуць у гэтыя святочныя дні адзінства народа Божага, над якім не маюць улады ніякія адлегласці.

Мір вам ад Госпада, дарагія браты і сёстры!

Хрыстос нарадзіўся! — Бог уцялесніўся!

Хрыстос пасярод нас! — І ёсць, і будзе!

Благаславёны, Хто прыходзіць у імя Гасподняе!

**ФІЛАРЭТ,**
**Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,**
**Патрыяршы Экзарх**
**усяе Беларусі**

*Раства Хрыстова*
*7 студзеня 2013 года,*
*горад Мінск*

# ЗІМОВАЯ ТВОРЧАСЦЬ

**Рэспубліканская выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў ладзіцца ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Выстава — гэта вынік правядзення рэгіянальных этапаў, якія прайшлі ў кожнай абласной установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.**

«Зіма», «Каляды Хрыстовы», «Новы год» — наведвальнікі змогуць ацаніць больш за 300 індывідуальных і калектыўных творчых работ такой тэматыкі з усіх куткоў Беларусі. Вырабы выкананы ў розных відах і тэхніках дэкаратыўна-прыкладной творчасці: выцінанка, саломка, маляванка, мастацкі роспіс, кераміка, вышыўка, ткацтва, габелен, аўтарская лялька, мяккая цацка; кампазіцыі на калядную тэматыку, навагоднія ялінкі з розных матэрыялаў. Самыя цікавыя, яркія і змястоўныя дзіцячыя працы былі прадстаўлены ў Палацы Рэспублікі на навагоднім дабрачынным свяце з удзелам кіраўніка дзяржавы для дзяцей, якія дасягнулі асаблівых поспехаў у вучобе, творчасці, спорце.

Выставу можна наведаць да 26 студзеня 2013 г. у выставачнай зале Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, 16. Уваход вольны.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**



**Фіналістка выставы-конкурсу Інга Гнацюк з майстэрні «Залатыя рукі» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі са сваёй работай «Адзін, два, тры — ёлачка, гары!».**



**На сёлетняй выставе-конкурсе была прадстаўлена калекцыя адзення «Зіма як белыя свечкі» маладога брэсцкага дызайнера Алены Кушнаровай.**



# ЯК У ВАШАЙ СЯМ'І ЗВЫЧАЙНА АДЗНАЧАЮЦЬ КАЛЯДЫ?



**Анастасія КУХАРЧУК, кіраўнік фермерскай гаспадаркі «ЕВА-ЛЭНД» Жабінкаўскага раёна:**

— Гэта любімае свята з дзяцінства. Калі мы былі малыя, то чакалі на Каляды падарункаў. Да гэтага дня ўсім спраўлялі абноўкі, а яшчэ дзецям давалі невялікія грошы, якія можна было траціць самастойна. Атрыманне падарункаў станавілася цэлым абрадам. Мы чакалі, пакуль дарослыя прыйдуць з царквы, павіншуюць усю сям'ю, сядуць за стол. Вось тады і пачынаўся працэс адорвання. З тых часоў у душы засталося нешта вельмі светлае і добрае. А цяпер мы абавязкова ўсе з'язджаемся на Каляды да мамы. Ёй 81 год, яна жыве ў Моталі Іванаўскага раёна. Брат з дзецьмі-ўнукамі, сястра з сямействам і я са сваімі таксама ўжо ўнукамі абавязкова выбіраемся да мамы. Цяпер мы вязём матулі падарункі. Сустракаемся ўсе, абменьваемся навінамі, разам гатуем святочны стол. Дарэчы, ездзілі ў гэты дзень у Моталь заўсёды, нават у атэістычныя часы. Бо мама свята Божага Нараджэння лічыла галоўным святам. А цяпер яно паступова стала святам сямейнага яднання і любові.



**Таццяна АЛЕСІК, пенсіянерка з вёскі Збураж Маларыцкага раёна:**

— Ніводнае свята ў нашай сям'і, як і ў вёсцы, не абыходзіцца без бабкі. Так мы называем хлеб з грэцкай мукі, які выпякаем самі. Я загадзя рыхтую муку, мялю грэчку ў сваіх жорнах, потым замешваю цеста. Хлеба рашчыняю звычайна многа, каб хапіла на святы і з сабой усім дарагім гасцям — дзецям і ўнукам. Цеста трэба не толькі вымесіць, каб яно адставала ад рук, але і падбіваць пры вымешванні, каб яно само варушылася, — так рабілі мая мама і бабуля. А выняўшы з печы бохан, я яго «ўмываю» халоднай вадой. Тады скарынка не будзе надта цвёрдай. Некаторыя дабаўляюць у бабку маргарын і яйкі, а я раблю свой хлеб посным, і яго можна ўжываць на куццю.



**Віталь ПЯЧКО, галоўны спецыяліст Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці:**

— За захаванне традыцый у нашай сям'і адказвае бабуля. Таму ў нас заўсёды бывае святочная куцця з 12-ю стравамі, з сенам пад абрусам. Усе пакаленні сям'і збіраюцца за сталом. А назаўтра, калі бывае снег, абавязкова катаемся на санях. Мае бацькі трымаюць коней.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Рабіць дабро

# «КАЛЯДНАЯ ЁЛКА — НАШЫ ДЗЕЦІ»

**8 студзеня гасцінна расчыняцца дзверы Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора і Белдзяржцырка для больш чым паўтары тысячы дзяцей і падлеткаў, якія пражываюць у раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, дзяцей, якія знаходзяцца ў дзіцячых рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтрах, выхаванцаў сямейных дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў.**

У гэты дзень у 13 гадзін у рамках дабрачыннай праграмы «Калядная ёлка — нашы дзеці» Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт у Свята-Духавым кафедральным саборы традыцыйна павіншуе хлопчыкаў і дзяўчынак са святам Божага Нараджэння і ўчыніць малітву за дзяцей Беларусі.

А крыху пазней, у 15 гадзін, юныя госці беларускай сталіцы адправяцца ў падарожжа па самай чароўнай і дзіўнай краіне, імя якой — цырк. Акрамя святочнага прадстаўлення і салодкіх падарункаў ад арганізатараў праграмы «Калядная ёлка — нашы дзеці», свае творчыя сюрпрызы маленькім гледачам падрыхтавалі заслужаныя артысты краіны і творчая моладзь.

Праект «Калядная ёлка — нашы дзеці», арганізатарамі якога традыцыйна выступаюць БРСМ, Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС МНС Беларусі, Епархіяльнае ўпраўленне Беларускай праваслаўнай царквы, з благаславення Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі і пры яго ўдзеле, збірае сваіх юных сяброў ужо 19 гадоў. Ён праводзіцца з мэтай сацыяльнай і творчай падтрымкі дзяцей і падлеткаў, якія пражываюць у аддаленых і пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС раёнах нашай краіны.

**Святлана БУСЬКО** ■

# НА РЭТРАЦЯГНІКУ Ў ПАРЭЧЧА І НАЗАД У ГРОДНА




**Чыгуначная станцыя Парэчча сёння найбольш вядомая, пэўна, шматлікім грыбнікам, якія ў сезон ужо традыцыйна едуць у навакольныя лясныя масівы, а таксама наведвальнікам тутэйшых санаторыяў і дзіцячых аздараўленчых лагераў. Але неўзабаве можа з'явіцца і яшчэ адна «фішка» — падарожжа на рэтрацягніку па 32-кіламетровым участку Гродна — Парэчча, які стаў першынцам чыгуначнай магістралі на беларускіх землях. Чым жа можна зацікавіць турыстаў? Першы крок у гэтым кірунку, як раней паведамляла «Звязда», быў зроблены 27 снежня 2012 года — менавіта ў той дзень, калі Беларуская чыгунка адзначала свой 150-гадовы юбілей.**





Фотаздымкі БЕЛТА.

Рэтрападарожжа пачынаецца на станцыі ў Гродне, дзе ветэранаў і цяперашніх работнікаў чыгункі, журналістаў чакаў святочны цягнік на паравознай цязе, а таксама аркестр, гудкі, машыніст Уладзімір Пракаповіч і яго памочнік Яўген Клімец у форменным адзенні XIX стагоддзя. Кандуктар у касцюме, які быў таксама спецыяльна пашыты да юбілейных мерапрыемстваў у швейным цэху Баранавіцкага аддзялення беларускай магістралі, пытае ў пасажыраў, ці ўсе з білетамі. Білет — са штампам Санкт-Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Паездка ў вагоне першага класа, між іншым, каштуе 70 капеек срэбрам.

Цягнік на ўсім шляху да Парэчча вітае гудкамі прыпыначныя пункты (яны былі адрамантаваны да юбілею Беларускай чыгункі) і людзей, якія там знаходзіліся. А экскурсавод тым часам узгадвае старонкі з гісторыі магістралі і яе першага ўчастка.

Чаму менавіта Парэччу выпаў гонар сярод першых трапіць на чыгуначную «карту»? Перавагай стала яго зручнае геаграфічнае становішча: 32 кіламетры ад Гродна, 17 — ад Друскенікаў, 775 — ад Санкт-Пецярбурга, 270 — ад Варшавы. Царскім урадам улічвалася, верагодна, і тое, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя тут размяшчаўся даволі буйны па тых часах лесапільны завод (пастаўка драўніны ў Еўропу была даходнай справай). У цэлым жа галоўным матывам будаўніцтва гэтай чыгункі з'яўлялася ўмацаванне ваенна-палітычнага ўплыву расійскага самадзяржаўя ў Каралеўстве Польскім і заходніх губернях імперыі.

Будаўніцтва Санкт-Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі, згодна з царскім указам, распачалося ў 1852 годзе і доўжылася 10 гадоў. Ужо ў наступным годзе па ёй было перавезена 1 мільён 254 тысячы пасажыраў, а грузаў — 18 мільёнаў 240 тысяч пудоў. Паводле тагачаснага разліку эфектыўнасці работы, даход перавысіў расход на 72 працэнты. Чыгунка паслужыла ў Прынямонні развіццю тэкстыльнай, тытунёвай прамысловасці, будаўніцтву шкляных і іншых заводаў.

Вагоны для першых цягнікоў па маршруце Санкт-Пецярбург — Варшава былі зроблены ў Англіі і іншых еўрапейскіх краінах і вельмі істотна адрозніваліся па ўзроўні сэрвісу. Найбольш камфартабельнымі з'яўляліся вагоны першага класа — з мяккімі сядзеннямі, задрапіраванымі тканінай сценамі купэ і зашклёнымі вокнамі. Кожнае было разлічана на восем пасажыраў, прычым яны выходзілі на перон адразу з купэ. У купэ другога класа размяшчалася дзесяць чалавек, трэці клас — гэта драўляныя сядзенні і незашклёныя вокны. А ў вагоне чацвёртага класа адстутнічаў... дах, і пасажыры сядзелі на падлозе альбо прымацаваных да яе лаўках. Адпаведна ўмовам — і кошт праезду. Напрыклад, за падарожжа ад Гродна да Варшавы ў вагоне першага класа трэба было заплаціць 9 рублёў 2 капейкі, што было супастаўна з коштам... дзвюх кароў. А ў Санкт-Пецярбург можна было даехаць у «першакласным« вагоне за 30 рублёў 19 капеек. Зразумела, што такі білет маглі сабе дазволіць толькі даволі багатыя людзі — чыноўнікі, афіцэры альбо інтэлігенцыя. Потым з'явіліся экспрэсныя цягнікі са спальнымі вагонамі, паштовыя цягнікі...

...Наш цягнік прыбывае на станцыю Парэчча. Каля гістарычнага будынка аднаго са старэйшых у Беларусі вакзалаў шматлюдна. Мясцовыя жыхары, як і тады, напрыканцы 1862 года, у чаканні свята. Навокал вакзала — мачтавыя асвятляльныя ліхтары ў стылі XIX стагоддзя, на пероне — жанчыны і мужчыны ў тагачасным адзенні, а тутэйшыя хлопчыкі раздаюць газету «Губернскія ведамасці», дзе галоўная тэма — адкрыццё ўчастка чыгункі паміж Гродна і Парэччам.

Праходзіць некалькі хвілін — і вось яны, галоўныя дзеючыя асобы ўрачыстасці: у «гістарычным цягніку» з адным, стылізаваным пад даўніну вагонам на станцыю прыбываюць афіцыйныя асобы з Санкт-Пецярбурга (артысты Гродзенскага абласнога тэатра).

Найбольш уплывовая персона сярод іх — гэта ўпраўляючы шляхоў зносін і публічных будынкаў, генерал-маёр Герстфельд, які кіраваў работамі па будаўніцтве гэтай магістралі. Ён засведчыў, што ўчастак дарогі Гродна — Парэчча ў цэлым гатовы да эксплуатацыі, але, разам з тым, адзначыў і шэраг недахопаў. У прыватнасці, дрэнна арганізавана харчаванне ўдзельнікаў будаўніцтва, выяўлена раскраданне прадуктаў харчавання, за што з нядбайных чыноўнікаў загадана спагнаць па месячнай зарплаце. У адваротным выпадку, прыгразіў Герстфельд, гэтыя чыноўнікі будуць пушчаны па этапе ў ссылку. Гэта цяпер, калі адбываецца інсцэніроўка, такая пагроза можа выклікаць усмешку. А паўтара стагоддзя таму было, мусіць, зусім не да жартаў.

У гонар 150-годдзя пастаяннага чыгуначнага руху па ўчастку Парэчча — Гродна на станцыі ўстаноўлены памятны знак і макет паравоза, а ў будынку вакзала арганізавалі выставу і музейную экспазіцыю па гісторыі Беларускай чыгункі. Усё гэта, трэба спадзявацца, цяпер убачаць не толькі грыбнікі, што прыязджаюць у Парэчча, але і пасажыры рэтрацягніка, які маркуецца задзейнічаць не толькі па святах.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



**Ігар МАРЗАЛЮК, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова:**

**— Год 2012 быў добрым для мяне з усіх бакоў. Рухаліся мае праекты ў гісторыі і археалогіі, я стаў лаўрэатам прэстыжнай стыпендыі Прэзідэнта Беларусі як малады навуковец — ужо другі раз.**

**У нашай сям'і быў дабрабыт і спакой. Мы цэлы год, як і ўсё грамадства, «па міліметры і граме» адыходзілі ад эканамічнага страсання ў мінулым і сваёй працай набліжалі стабільнасць у эканоміцы, палітыцы, культуры.**

**Вельмі ганаруся тым, што стаў сенатарам. Гэта першы выпадак у гісторыі беларускага парламентарызму, калі ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу патрапіў прафесійны гісторык!**

**У 2013 годзе я найперш хачу пажадаць сабе і ўсім грамадзянам Беларусі здароўя, фізічнага і інтэлектуальнага. Перш чым стагнаць і жаліцца на цяжкае жыццё, раю ўсім раніцай зірнуць у люстэрка і шчыра парадавацца ад усёй душы і сэрца, што вы здаровы чалавек, які можа жыць і працаваць.**

## Факт

### «ПАДАЙЦЕ СЫНУ ЛЕЙТЭНАНТА ШМІТА!»

**У Бабруйску з'явіўся свой Шура Балаганаў. Скульптура знакамітага літаратурнага персанажа ўсталявана каля рэстарана «Чырвоная вежа».**



Ініцыятарам выступіла гарадское прадпрыемства «Водаканал». Аўтарам скульптуры стаў маскоўскі майстар Яраслаў Барадзін. Здаецца, Шура Балаганаў спыніўся каля ярка-ружовага падаконніка рэстарана. Малады мужчына ў адзенні 20-х гадоў мінулага стагоддзя папраўляе кепі, а ў другой руцэ трымае талерку з сімвалічным «залатым цялём», паводле назвы кнігі Ільфа і Пятрова. Там жа ёсць і цытата з твора пра сход «сыноў лейтэнанта Шміта», якія ўсе хацелі ехаць у цудоўны, высокакультурны горад Бабруйск.

Бабруйчане і госці горада цяпер актыўна фатаграфуюцца каля новай скульптуры, а на талерку кладуць дробныя грошы — «на шчасце і ўдачу». Акрамя таго, людзі частуюцца гарачым глінтвейнам, які ўзімку рэстаран прапануе тут жа на вуліцы.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ГРАН-ПРЫ Ў ПЯЦІКЛАСНІЦЫ З ПАСТАВАЎ

**10-гадовая цымбалістка Ліза Глазава з Паставаў заваявала Гран-пры на Міжнародным конкурсе-фестывалі мастацтваў маладых выканаўцаў «Палаюча зірка», які праходзіў у сталіцы Украіны.**

На конкурсе Ліза адна прадстаўляла нашу краіну. Разам з ёй за Гран-пры змагаліся больш як семдзесят выканаўцаў з Украіны і Расіі. Цікава, што, акрамя традыцыйных дыплома і статуэткі, нашай землячцы ўручылі «гасцявы ваўчар» выхаднога дня ў Еўпаторыю (на два дні і на двух чалавек).

Юная пастаўчанка ў сваёй творчай скарбонцы ўжо мае пару дзясяткаў дыпломаў лаўрэата, у тым ліку і міжнародных творчых спаборніцтваў і фестываляў. Дзяўчынка ўжо цвёрда вырашыла, што пасля таго, як скончыць школу, паступіць у Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі, каб стаць прафесійным музыкантам.

### ДЗЕЦЯМ, ЯКІХ МАГЛО І НЕ БЫЦЬ

**У Віцебску актывісты дабрачыннага фонду «Адкрытыя сэрцы» арганізавалі святочны ранішнік для дзяцей, якія маглі не нарадзіцца, калі б іх мамы зрабілі аборт. Свята адбылося ў прыходзе новага віцебскага касцёла Ісуса Міласэрнага.**

Валанцёры фонду і каталіцкія святары ў свой час, да нараджэння дзетак, пераканалі жанчын, якія першыя некалькі тыдняў насілі іх пад сэрцам, што забіваць ненароджанае дзіця — смяротны грэх. І вось хлопчыкі і дзяўчынкі, якія атрымалі жыццё дзякуючы таму, што іх мамы зрабілі правільны выбар, былі запрошаны на свята. Зразумела, са сваімі мамамі, а таксама сястрычкамі і братамі — у каго яны ёсць. Дзеці ўбачылі прадстаўленне традыцыйнага беларускага лялечнага тэатра — батлейкі, бралі ўдзел у розных конкурсах, атрымалі падарункі. Удзельнікаў свята асабіста павіншаваў глава віцебскай каталіцкай епархіі — біскуп Уладзіслаў Блін.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ДЗІКІ ХВАРЭЮЦЬ НА ТРЫХІНЕЛЁЗ

**У Баранавіцкім раёне праводзіцца адстрэл дзікоў у сувязі з выяўленнем выпадкаў трыхінелёзу. Першых хворых дзікіх жывёл выявілі яшчэ ў кастрычніку. Тады і ўстанавілі прычыну гібелі — трыхінелёз. Райвыканкам прыняў рашэнне аб правядзенні маніторынгу па выяўленні захворвання. У тым ліку быў прадугледжаны адстрэл дзікоў.**

За час пасля прыняцця дакумента застрэлена 98 жывёл, 62 знойдзены мёртвымі. Паводле інфармацыі Баранавіцкага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, адстрэл праводзіцца ў радыусе 35 кіламетраў ад эпіцэнтра ачага захваральнасці — граніцы з Навагрудскім раёнам. Ва ўсіх адстрэленых асобін і тых, што знойдзены мёртвымі, бяруцца пробы для аналізаў, якія праводзіць міжраённая ветэрынарная лабараторыя. Потым усе тушы спальваюцца. Спецыялісты лічаць мэтазгодным праводзіць адстрэл да поўнага знішчэння ўсіх магчыма заражаных жывёлін. Трыхінелёз — небяспечнае паразітарнае захворванне.

**Яна СВЕТАВА.**

### НАПАД НА ТАКСІСТА Ў АПОШНІ ДЗЕНЬ 2012-ГА

**31 снежня ў Оршы а першай гадзіне ночы двое мужчын учынілі разбойны напад на таксіста.**

Як расказаў таксіст супрацоўнікам Аршанскага раённага аддзела ўнутраных спраў, у яго машыну селі двое мужчын і папрасілі адвезці іх за горад. У бязлюдным месцы пасажыры завалодалі яго маёмасцю і грашыма. Потым кіроўцу выкінулі з машыны і на ёй накіраваліся ў бок Расіі.

Паводле інфармацыі прэс-службы ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, міліцыянеры Віцебшчыны неадкладна звязаліся з паліцэйскімі з упраўлення МУС па Смаленскай вобласці і перадалі арыенціроўку на аўтамабіль і падазроных. Дзякуючы дзеянням праваахоўнікаў абедзвюх краін ужо праз некалькі гадзін паліцэйскія ў Смаленску знайшлі ўкрадзены аўтамабіль. Былі затрыманы двое грамадзян Беларусі (1972 і 1991 гадоў нараджэння).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Разумнае. Добрае. Вечнае

# УРОКІ РЫТОРЫКІ І... ЧАЛАВЕКАЛЮБСТВА

## Дасягненні — гэта зусім не абавязкова кар'ера

**Зараз вучэбная аўдыторыя № 3-8 у гомельскай гімназіі № 14 больш падобна да казачнага церама. Пад навагоднімі ліхтарыкамі зззяюць крэатыўныя ёлкі, выраблены рукамі вучняў. Інтэрактыўная дошка і кніжныя шафы, запоўненыя разнастайнымі слоўнікамі і рарытэтнымі выданнямі, упрыгожаны навагоднімі гірляндамі. На ўроках мовы і літаратуры тут слухаюць музыку і інсцэніруюць байкі, якія не ўваходзяць у школьную праграму. Гаспадыня — настаўніца Жанна Жадзейка — чароўна ўзмахвае рукой, на якой завязана шмат рознакаляровых нітачак-фенечак, і пачынаецца наш дыялог... пра выхаванне школьнікаў, якія стабільна перамагаюць на самых розных філалагічных алімпіядах у краіне і за яе межамі. Але не толькі пра гэта. Дарэчы, не магу не пацікавіцца пра фенечкі на руцэ.**



— Сёння ў нашай гімназіі — Дзень добра. Вось таму школьнікі адзін аднаму завязваюць з добрымі пажаданнямі на руку такія нітачкі. Вось і мне наважадалі. У нас штотыдзень што-небудзь цікавае адбываецца. Напрыклад, выстаўка «Фота на прышчэпках». Працягнулі вяровачку праз увесь клас — і атрымалася гірлянда з фотаздымкаў. А тут, на дзвярах — апошнія фотаздымкі з нашых сумесных вандровак. Вось мы — на выставе матылькоў. Гэта — у аквапарку на адпачынку ў Юрмале. На зімовых канікулах едзем з маім шостым класам у Мінск на галоўную ёлку краіны. Я ж класны кіраўнік — і мае дзеткі не павінны цярпець ад таго, што многа працы з алімпіяднікамі. Алімпіяднікі — гэта тыя ж вучні, і асобных гадзін на занятків з імі нікто не выдзяляе. Проста патрэбна пастаянная карпатлівая штодзённая праца.

**— Сярод вучняў вы хутка вызначаеце будучых пераможцаў алімпіяд?**

— На першым уроку ў 5 класе я кажу дзецям, што ўсе таленавітыя. Толькі ў кожнага — свой талент. Кажу: пакуль вы вучыцеся, розныя ацэнкі можна атрымліваць. Што гэта за вучань, які мае толькі «9» і «10»? Адразу вызначыць будучых пераможцаў вельмі складана, хоць дзяцей са здольнасцямі відаць адразу. Але ж сярод іх ёсць пчолкі, а ёсць і матылькі. Некаторыя схопліваюць на ляту, а працаваць не хочуць. А вынікі ўрэшце і ад працаздольнасці залежаць. Часта тыя дзеці, якія не маюць выдатных здольнасцяў, але ж вельмі хочуць перамагчы, і становяцца пераможцамі алімпіяд.

**— Гімназія заўсёды збірае асабліва моцных і здольных дзяцей, але ж ускраіна Валатавы — не той раён у горадзе, дзе ёсць магчымасць адбіраць...**

— Так, у нас вучацца самыя розныя дзеці. Вельмі часта я даю ім магчымасць ацэньваць адзін аднаго. Напрыклад, пішам графічны дыктант, а потым школьнікі мяняюцца сшыткамі, чырвоным колерам выпраўляюць памылкі адзін у аднаго і самі выстаўляюць адзнаку. Яны ведаюць, за што колькі балаў ставіць. Ім вельмі падабаецца такая форма работы. Заўсёды кажу дзецям: калі не згодны з адзнакай — павінны гэта высветліць карэктна. Увогуле, трэба ўмець адказваць прыгожа. Напрыклад, хлопчык сёння пачаў свой адказ так. «Нават не ведаю, што вам на гэта і сказаць, Жанна Фёдараўна...» Рыторыка ў дзеянні! *(Усміхаецца.)*

**— Дарэчы, у вашай гімназіі выкладаецца рыторыка. На мой погляд, гэта вельмі важна. Тым больш што сёння многія дзеці амаль не размаўляюць па-за сценамі школы — сучасныя тэхналогіі гэтаму не спрыяюць. І памылкі правяраюць на камп'ютары.**

**Нельга ператвараць увесь урок у гульню. Вучоба — гэта праца. Хто сказаў, што яна будзе лёгкай?**

— Дарэчы, камп'ютар вельмі часта выдае наяўнасць памылкі там, дзе яе няма. Цікава, хто складаў гэтую праграму? Магчыма, добры праграміст, але не вельмі пісьменны вучань. Пісьменнасць чалавека — гэта паказчык узроўню яго культуры. Што датычыцца маўлення, я ніколі не выкідаю з праграмы такія тэмы, як «вучэбнае паведамленне». Лічу, што навык маўлення не менш важны, чым пісьмо. Каб быць паспяховым, трэба ўмець размаўляць, — даносіць да іншых сваю думку, сваю ідэю. Дарэчы, рыторыка карыстаецца папулярнасцю не толькі ў нашай гімназіі, але і ў вобласці ўвогуле. Зараз я распрацавала ўрокі па рыторыцы ў 11 класе, і мы імкнёмся навучаць у комплексе: і маўленню, і арфаграфіі, і пунктуацыі, і сінтаксісу... Дарэчы, тым, хто трапляе ў нашу гімназію ў 10-11 класе, куды больш складана навучыцца прыгожа размаўляць, чым тым, хто тут вучыцца з пятага класа. Як сказала адна з маіх алімпіяднiц: «Жанна Фёдараўна, вы вельмі хутка можаце адвучыць нас ад спалучэння «як бы». Калі мы так гаворым, вы пытаеце: Ты "як бы" ці на самой справе?». Так што ўсміхаемся мы штодзень — з сябе ў першую чаргу.

**— Методыкі выкладання для алімпіяднікаў — гэта вашы асабістыя распрацоўкі?**

— Я прыходжу ў школу для таго, каб асновы ведаў былі закладзены на ўроку. У малодшых класах выкарыстоўваюцца элементы гульні. Але ж нельга ператвараць увесь урок у гульню. Вучоба — гэта праца. Хто сказаў, што яна будзе лёгкай? Я вяду вучняў з 5 класа і выпускаю іх у 11-м. Такім чынам, магу бачыць вынікі сваёй працы. І яшчэ — ніводзін з алімпіяднікаў не прыйшоў у алімпіядны рух пад націскам. Малодшыя глядзяць на пераможцаў, як на багоў, і хочуць быць падобнымі да іх. Галоўнае — жаданне, матывацыя і праца.

**— А якая матывацыя ў сённяшніх дзяцей? Стаць першым? Паступіць у ВНУ?**

— Калі яны пасля пачатковай школы пачынаюць займацца, то не думаюць пра тое, каб стаць паспяховым у жыцці. Спачатку павінен быць звычайны інтарэс, таму настаўніку трэба пасеяць насенне любові да мовы. Потым дзеці пачынаюць адчуваць смак да слова, ім падабаецца. Матывацыя з працягам часу паступова мяняецца, звужаецца. Удзел у розных конкурсах дае магчымасць праявіць сябе. Я ніколі нікога не настройваю паступаць толькі ў гуманітарныя ВНУ. У кожнага свая дарога, свой лёс...

**— Былі вучні, якія вас расчаравалі?**

— Не было. Былі дзеткі, пра якіх я думала: што ж мне рабіць, каб быў хоць нейкі вынік? І яны дасягалі пэўных, а часам і дастаткова высокіх вынікаў. Я ганаруся літаральна ўсімі сваімі вучнямі. Бо дасягненні — гэта зусім неабавязкова кар'ера. Мне падабаюцца радкі Яўгена Еўтушэнкі: «Я раблю сабе кар'еру тым, што не раблю яе». Значыць, выконваю сумленна сваю справу. Многія мае вучні сталі добрымі бацькамі — хіба яны не адбыліся ў жыцці? Сёння былыя вучні ўсміхаюцца мне ў краме, у банку, у паліклініцы — паўсюль, дзе яны працуюць. Я спрабую дастукацца да кожнага, але ж стукаюся не толькі я, таму вынікі бываюць розныя. Тут важнае і супрацоўніцтва з бацькамі. Калі ёсць кансэнсус — будзе добра, калі няма... Перажываю, што недадала. Застаюцца раны на сэрцы... Заўсёды дзецям кажу, што дасягненні ў вучобе — не галоўнае. Галоўнае — быць чалавекам. Важна даваць веды па прадмеце, яшчэ больш важна — даваць урокі чалавеказнаўства, чалавекалюбства, чалавекаразумення...

**Як можна выпускаць такую макулатуру, як «рашэбнікі» — гатовыя дамашнія заданні? Мала таго, што яны выдаюцца з памылкамі, дык увогуле наносіцца шкода адукацыі.**

**— І літаратура ў гэтым плане адыгрывае не апошнюю ролю...**

— Можна і трэба вучыцца на чужых памылках — памылках літаратурных герояў. Не хацелася б, каб сетку школьных заняткаў пакінула літаратура, як прапаў прадмет «сусветная мастацкая культура». Мае былыя вучні часта кажуць «дзякуй» менавіта за літаратуру. Я не разумею, як можна чытаць класічныя творы ў «кароткім пераказе». Як можна выпускаць такую макулатуру, як «рашэбнікі» — гатовыя дамашнія заданні? Мала таго, што яны выдаюцца з памылкамі, дык увогуле наносіцца шкода адукацыі. Важна, каб вучань не толькі аўтаматычна ўставіў прапушчаную літару ў слова, але і растлумачыў, чаму ён так зрабіў. Гатовыя адказы не спрыяюць атрыманню і замацаванню ведаў, як і тэсціраванне. Становучае ў ім толькі тое, што вынік выпрабавання тэсціраваннем незалежны. Але ж з карупцыяй можна было б змагацца, правяраючы дыктанты. Сёння ж можна паўсюль устанавіць камеры і скапіраваць работы, перш чым яны трапляюць да правяраючых. Тэсціраванне ператварае людзей у запраграмаваных істот, аднаскладовыя адказы не развіваюць асобу.

**— Вашы алімпіяднікі прайшлі б тэсціраванне на «выдатна»?**

— Ім гэта не патрэбна, бо яны паступаюць у ВНУ па выніках сваіх перамог на алімпіядах. Дарэчы, вялікае пытанне, ці адказалі б яны на 100 балаў. Для добра падрыхтаваных дзяцей, якія думаюць, тэсціраванне — гэта магчымасць атрымаць не 100 балаў, а менш. У моўных пытаннях часта ёсць падвоеныя варыянты адказаў, у тым ліку і ў слоўніках. Толькі матэматыкі па складзе мыслення запамінаюць пэўны алгарытм, па ім ідуць і атрымліваюць добрыя балы. Пры гэтым дыктант такія дзеці напішуць з памылкамі.

**— Закончыўся Год кнігі. Якія мерапрыемствы былі для вас самымі важнымі?**

— Сёлета па выніках алімпіяд Саюзнай дзяржавы выйшаў зборнік матэрыялаў «Расія і Беларусь — гістарычная і духоўная супольнасць». Адным са складальнікаў гэтага двухтомнага выдання з'яўляюся і я — разам з прафесарам Гомельскага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Уладзімірам Ковалем.

*Абсалютным пераможцам сёмай алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная супольнасць» стала навучэнка гімназіі № 14 з Гомеля Вольга Нянашава, якая набрала максімальную колькасць балаў. За 7 гадоў правядзення алімпіяды Гомельская вобласць 5 разоў заваёўвала першыя месцы і 2 разы — другія. Нязменным трэнерам гомельскай каманды з'яўляецца выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, член рады спецыяльнага Фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы адоранай і таленавітай моладзі, настаўнік рускай мовы і літаратуры гімназіі № 14 Гомеля Жанна Жадзейка.*

**29. н. *Міхал.*** «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». ***Сіцьян.*** «Святы Сацыян да ляны пасцілаў».

## Кастрычнік

**2. с. Зосім.** «Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць».

**3. ч. Астап (Астаф'я).** Прыкметы па ветры.

**4. пт. *Пранцішак (Францішак).*** «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

**8. а. Сяргей. Жалезны тыдзень.**

**9. с. Іван Шаптун (Іван Кураед, Багаслоў).** Шапталіся свахі пра нявест.

**14. п. Пакровы (Трэцяя Прачыстая).** Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы».

**21. п. Трыфан, Палагея.** «Трыфан кажух латае, Палагея рукавічкі вяжа». ***Зміцер.*** «Зміцер зямлю выцер, на груды пабіў, каб ніхто не хадзіў».

**25. пт. Марцін** — свята млынароў. Млынары частаваліся на каменным крузе гусяцінай.

**28. п. *Сымон і Юда.*** «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць».

**29. а. Лонгін.** Збавіцель ад хвароб вачэй. ***Параскева Пятніцкая.***

**30. с. Паклоны.** Адбівалі паклоны пакутніку Андрэю Крыцкаму.

**31. ч. Лука.** «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

## Лістапад

**1. пт. *Усе святыя.*** Памінальны дзень у католікаў.

**2. сб. *Задушны дзень.*** Памінальны дзень. **Змітраўскія Дзяды. Асяніны.** «Святыя Дзяды, завём вас...».

**4. п. Казанская.** «Хто на Казанскую жаніхаецца, той не пакаецца».

**8. пт. Зміцер.** «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

**9. сб. *Тодар.*** «На Тадора поўна камора».

**10. н. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.

**11. п. Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.*** Свята млынароў. Мядзведзь кладзецца ў бярлогу.

**12. а. Артошка.** Пачатак прадзення.

**14. с. Кузьма-Дзям'ян.** Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

**21. ч. Міхайлаў дзень.** Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

**22. пт. Матрона.** «З Матроны становіцца зіма».

**24. н. Хвёдар Студзянец.** «Хведаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

**25. п. Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў. ***Кацярыны.*** «Кацярына забрала лета».

**27. с. Юстыніян. Піліп** — пярэдадзень Піліпаўскага посту (да 7 студзеня).

**28. ч. Піліпаўка** — перадкалядны пост.

**29. пт. Мацей.** «На Мацея зіма пацее».

**30. сб. *Андрэй.*** Дзявочае свята.

## Снежань

**1. н. *Адвэнт.***

**4. с. Увядзенне.** Водзяцца ваўкі. ***Барбара.*** «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла».

**5. ч. Пракоп.** «Прыйдзе Пракоп хмуры — раскапае гуры». ***Савы.*** «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

**6. пт. Матрыхваны.** Не пралі. ***Мікола.***

**7. сб. Кацярыны.** «Забрала край лета».

**9. п. Юр'е Зімовы.** Юра мосціць. ***Ганны.*** «Ад Ганнаў да Каляд два тыдні і два дні».

**13. пт. Андросы, Андрэйкі.** Варажылі.

**14. сб. Навум.** «Навум наставіць на вум». Пачыналі вучыцца.

**17. а. Варвары.** «Мікола і Варвара ноч урвалі».

**18. с. Савы, Міколін бацька.** «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

**19. ч. Мікола Зімовы.** «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».

**22. н. Ганны.** «Ганкі — сядайце на санкі». Зімовае сонцастаянне ( і 21.12). Даўжыня дня 7.23, усход 9.26, захад 16.50.

**24. а. *Посная куцця.*** Пачатак Каляд (да 6 студзеня)

**25. с. Спірыдон Сонцаварот. *Божае Нараджэнне.***

**26. ч. *Сцяпан.*** «Кожны сабе пан».

**31. а. Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка». ***Багатая куцця. Сільвестр.***

**Складальнік Алесь ЛОЗКА.**

| | Студзень | Люты | Сакавік | Красавік | Май | Чэрвень |
|---|---|---|---|---|---|---|
| П | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 |
| А | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 |
| С | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 |
| Ч | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 |
| П | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 |
| С | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 |
| Н | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 |

| | Ліпень | Жнівень | Верасень | Кастрычнік | Лістапад | Снежань |
|---|---|---|---|---|---|---|
| П | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 |
| А | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 |
| С | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 |
| Ч | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 |
| П | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 |
| С | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 |
| Н | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 |

# ХАТНЯЕ ВЫХАВАННЕ

## Глазковы з Магілёва ў 2012 годзе перамаглі ў рэспубліканскім конкурсе і сталі «Сям'ёй года»



**Яны жывуць разам — пяць дзяцей (ад 4-х да 15 гадоў), бацькі, бабуля і... дзве маленькія сабачкі. У звычайнай трохпакаёвай кватэры знаходзіцца месца для ўсіх. Хаця падаецца, што адасобленасць — гэта ўвогуле не ўласціва для Глазковых: дзеці і дарослыя нязменна збіраюцца ў адным пакоі, гутараць і адчуваюць сябе добра не паасобку, а ў вялікай кампаніі.**

**Увогуле, гэта настаўніцкая сям'я. Бабуля Яўгенія Дзмітрыеўна Дубіцкая — дырэктар сярэдняй школы № 34 горада Магілёва, яе зяць Мікалай Віктаравіч Глазкоў кіруе школай № 43, а яго жонка Таццяна Рыгораўна працуе настаўніцай матэматыкі і працоўнага навучання.**

**Старэйшы сын Жэня цяпер вучыцца ў сталіцы, але дзяцей у сям'і па-ранейшаму пяць: да іх далучылася 15-гадовая Даша, якая засталася без апекі ўласных бацькоў. Цяпер у яе ёсць сястрычкі-сяброўкі: 14-гадовая Вольга, 11-гадовая Вера і 10-гадовая Ульяна. Усе прыгажуні і разумніцы! Самы маленькі — абаяльны Яраслаў.**

### ДЭМАКРАТЫЯ Ў МЕЖАХ КАРЫСНАГА

— У нас — дэмакратыя, а не ланцугі, — упэўнена кажа маці Таццяна Рыгораўна.

Дэмакратыя Глазковых складаецца з некалькіх частак. Мікалай Віктаравіч як галава сям'і прытрымліваецца строгіх правілаў. Ён родам з моцнай вясковай сям'і, са сваімі жыццёвымі прынцыпамі.

— Адносіны ў сям'і будуюцца на аснове павагі і... пастаўленых задач, — лічыць тата Глазкоў. — У кожнага — свае задачы. Для дзяўчынак гэта пакуль што добрая вучоба, а для Яраслава — дзіцячы садок і алфавіт. Так што ў нас дэмакратыя, але ў межах карыснага.

— Мужчыны заўсёды за парадак, — гаворыць яго жонка. — А я — маці, пяшчотная і мяккенькая.

Муж і жонка Глазковы згодны з тым, што дзіця павінна адчуваць, як яго любяць.

— Усё лепшае — для дзяцей, — працягвае Таццяна Рыгораўна. — Але разам з тым, і разуменне таго, што трэба дзяліцца. У нашай сям'і ёсць праблема апошняга кавалка: калі на талерцы застаўся торцік альбо цукерка, ніхто ніколі не возьме. Спачатку абмяркуюць: хто больш хоча, каму больш патрэбна.

— Дэмакратыя ў сям'і — гэта свабода выказаць сваё меркаванне, — тлумачаць бацькі (дзеці чуюць гэта і, згаджаючыся, качаюць галовамі). — Усе могуць адкрыта сказаць, што думаюць. Для нас важны дыялог.

### БАЦЬКОЎСКІ ПРЫКЛАД

— Выхаванне павінна будавацца на ўласным прыкладзе, — такую важную выснову робіць бабуля і школьны дырэктар Яўгенія Дзмітрыеўна. Так у іх сям'і павялося з даўніх часоў. Яе маці, прабабуля цяперашніх дзяцей Глазковых, таксама была настаўніцай. Сям'я жыла ў прыватным доме, дзе была вялікая хатняя гаспадарка.




— Дзеці і дарослыя рабілі ўсё разам: мы вучыліся ў бацькоў і дапамагалі ім, а потым вучылі сваіх дзяцей, — узгадвае Яўгенія Дзмітрыеўна. — І яшчэ важны складнік выхавання ў нашай сям'і — абавязковая адукацыя.

Яўгенія Дзмітрыеўна прыводзіць красамоўны прыклад з ківі. Ніхто не ведаў калісьці, што гэта за шурпатае дзіва з'явілася ў продажы, але рассмакавалі і цяпер не лічаць за экзотыку.

— Так і падлеткам важна паспрабаваць розныя віды дзейнасці. Нашы дзяўчынкі, як калісьці іх прабабуля, вяжуць і вышываюць. Я сама захаплялася разьбой па дрэве. Вера піша вершы, Вольга — спартсменка.

Глазковы-малодшыя будуюць планы на перспектыву. Даша хоча стаць стылістам. Вера думала пра ветэрынарыю, але цяпер ёй больш цікавая экалогія. Вольга хоча звязаць сваё жыццё з гісторыяй. Аднак больш за ўсіх здзівіла Ульяна: у свае 10 гадоў яна ўпэўнена, што стане супрацоўнікам ДАІ, каб сачыць за парадкам на дарогах і штрафаваць парушальнікаў. Вось так!

### ДЗЕ МАЕ ДЖЫНСЫ?

Гэта жаночая частка сямейнага жыцця. Дзяўчынкі адгукаюцца на просьбу маці без пярэчанняў. Дочкі нават спрабавалі скласці графік хатняй працы, прышпілівалі яго на халадзільнік для нагляднасці. Аднак цяпер і без дакументавання ўсе ведаюць і выконваюць свае хатнія абавязкі.

Даша падмятае падлогу і выцірае пыл, у тым ліку і на камп'ютары. Вольга выбрала мыццё посуду: маўляў, калі не я, то хто? Вера, не паверыце, любіць абіраць бульбу і лічыць гэта не працай, а забавай. А таксама гатуе ежу: ёй толькі 11 гадоў, але дзяўчынка ўжо добра спраўляецца з пельменямі, блінчыкамі і чабурэкамі. Ульяна таксама не супраць гатавання ежы, але яна часцей за ўсё гуляе з сабакамі і дагледае Яраслава.

— А маці — дырыжор у нашай кампаніі, — смяюцца Глазковы.

— Шчасце мець такіх дачок! — прызнаецца Таццяна Рыгораўна.

Ніякага сакрэту, як прывучыць дзяцей да парадку, у Глазковых няма. У кожнай дзяўчынкі — свае паліцы ў шафе для кніг і адзення. Звычайна там усё роўненька складзена, але ўсё ж часам даводзіцца рабіць заўвагі, а таксама прымушаць уладальніка шукаць «згубленыя» джынсы.

— Мы, натуральна, усе жывыя людзі, — заўважае Таццяна Рыгораўна. — Але на пытанне «Хто бачыў мае джынсы?» я адказваю, што кожны павінен класці свае рэчы там, дзе ім месца.

### ХОЧАШ НОВЫ ТЭЛЕФОН? ЗАРАБІ!

Жыццё ёсць жыццё, і ніхто не ідэальны (дзякуй Богу!): як і ўсім бацькам, Глазковым-старэйшым даводзіцца рабіць дзецям заўвагі. Ёсць некалькі табу: натуральна, ніякага фізічнага пакарання — тут усе законапаслухмяныя і культурныя людзі. Гуляць можна толькі пасля выканання хатніх заданняў. Увечары да 20 гадзін усе павінны быць дома.

— Мы маем кватэру, аўтамабіль, камп'ютар, бытавую тэхніку, — пералічвае Таццяна Рыгораўна. — Калі некаму хочацца новы тэлефон, а грошай няма — кажам, што трэба пачакаць. Калі размова ідзе пра рэч, якую мы зараз не можам сабе дазволіць, то раім збіраць грошы альбо пайсці папрацаваць.

Прынамсі, дзве дачкі Глазковых так і зрабілі: улетку дапамагалі на мясцовым рынку, і ўрэшце модныя джынсы дзяўчаты набылі за ўласныя сродкі.

— У кожнай дзяўчынкі — свой характар: адной патрэбна толькі асаблівае адзенне, а іншая задаволена тым, што дасталася ў спадчыну ад старэйшых сясцёр, — каментуе Таццяна Рыгораўна. — Кампраміс заўсёды можна знайсці. Ва ўсякім разе, грашова-рэчавых канфліктаў у нас не было.

— Мы даём нейкія грошы дзецям, — кажа бацька. — Не штодня, таму што яны харчуюцца ў школе. Але дорым нейкія сумы на святы. Аднак заўсёды нагадваем: жыць трэба па сродках.

### ЛЮБІЦЕ! І ВЕРЦЕ Ў ЦУДЫ

У час зімовых канікулаў дзяўчынкі аддаюць перавагу катанню на каньках. Снежныя горкі і прагулкі на свежым паветры таксама на карысць. Новы год — любімае свята дзяцей, ад якога чакаюць выканання жаданняў.

— Жадаю ўсім цудаў! — гаворыць Мікалай Віктаравіч. — Каб усе былі здаровыя, і мары спраўдзіліся! Любіце сваю сям'ю, сябе і сваіх дзяцей!

— Наша ўжо спраўдзілася: мы хацелі стаць «Сям'ёй года» — так і атрымалася, — падхоплівае Таццяна Рыгораўна. — А ў 2013 годзе вельмі чакаем пераезду ў новую кватэру, дзе будзе больш прасторна і ўтульна нам усім. А ўсім людзям жадаю кахання, цеплыні, дабрыні і стабільнасці! Няхай у вашым доме гучаць радасныя дзіцячыя галасы, свецяцца ад шчасця твары малых!

**Ілона ІВАНОВА.**

---

**Святлана ШАЎЧЭНКА, дырэктар навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі:**



**— Для мяне ў мінулым годзе вельмі значным стала тое, што сярод моладзі, якая працуе ў нашым НДІ, я ўбачыла маладых навукоўцаў, адказных, талковых, якія хочуць стаць прафесіяналамі.**

**Яны, нягледзячы на сціплы ўзровень аплаты працы ў навуцы сёння, самааддана выконваюць складаныя навуковыя даследаванні, што маюць высокую практычную значнасць у нашым грамадстве. І мне б вельмі не хацелася іх страціць у 2013 годзе. А яшчэ сёлета хацела б пачуць: «Мама, ты хутка станеш бабуляй!».**

---

■ Агульны дом

# СЯМ'Я — У ПАДАРУНАК

**Пра якія падарункі на Раство мараць нашы дзеці? Самыя розныя. Цяпер яны замаўляюць часцей за ўсё нешта з найноўшай тэхнікі, малыя, як і раней, чакаюць цацкі. А дзеці, у якіх няма сям'і, больш за ўсё на свеце хочуць тату і маму. Шасцёра такіх дзяцей атрымалі самы вялікі ў сваім жыцці падарунак — сям'ю.**

Шасцёра выхаванцаў дзіцячых дамоў і прытулку: Соня, Маша, Віка, Ваня, Жэня і Саша — сталі сынамі і дочкамі Таццяны і Сяргея Хамутовых. У Кобрыне адкрылі дом сямейнага тыпу. Новы двухпавярховы катэдж узведзены па суседстве з Кобрынскай дзіцячай вёскай. У доме восем дзіцячых пакояў. Побач — прасторны двор, ёсць гаспадарчае памяшканне, месца для невялікага агарода.

Дзецям ад чатырох да дзевяці гадоў. Яны вельмі даверліва і адкрыта цягнуцца да дарослых. І відаць, якую доўгую і, мабыць, нялёгкую дарогу давядзецца пераадолець бацькам, каб адагрэць іх душы, загартаваць характары.

У іх, Таццяны і Сяргея, павінна ўсё атрымацца. Яны поўныя рашучасці, хоць і былі трохі разгубленыя на ўрачыстым адкрыцці ад мноства людзей, ад павышанай увагі. Але нібы свяціліся знутры. Ім даверылі стаць бацькамі дзяцей, якія ад нараджэння недаатрымалі любові і дабрыні. Хамутовы — маладыя людзі, ім няма трыццаці гадоў. Але рашэнне прымалі павольна, асэнсаваўшы ўсе «за» і «супраць», наколькі гэта можна асэнсаваць загадзя. Таццяна, выпускніца Баранавіцкага ўніверсітэта, працавала ў школах раёна, апошні час — сацыяльным педагогам. Сяргей мае вышэйшую тэхнічную адукацыю, працуе на адным з прадпрыемстваў Кобрына. Праўда, яму таксама выдзелілі паўстаўкі выхавальніка. Бо адной маці з такой сям'ёй і з такім домам справіцца будзе цяжка.

Усё ў іх яшчэ наперадзе: і радасці, і цяжкасці. Але гэта будуць іх сямейныя набыткі і праблемы. Цяпер яны — адна сям'я. З часам тут з'явіцца яшчэ двое дзяцей. Пакуль жа малыя з задавальненнем паказвалі свае пакоі, цацкі, кніжкі. Калі толькі паспелі асвоіцца?

Кіраўнік Кобрынскага ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Мікалай Кожух зрабіў цікавае назіранне, пра што паведаміў усім прысутным падчас адкрыцця. Ён напярэдадні дапазна затрымаўся ў гэтым доме. Як заўсёды бывае перад адкрыццём, будаўнікі наносілі нейкія апошнія штрыхі. Шчыравала і Таццяна: там трэба падправіць, там падпрасаваць. А муж дапамагаў. Мікалай Васільевіч назіраў, як дзеці кідаліся ім дапамагаць: «Мама, можна — я? Тата, можна — я?». Перашкаджалі, вядома. Але ж яны лічылі, што дапамагаюць, як у сапраўднай сям'і. І так гэтая карцінка расчуліла сталага мужчыну, што нават жонка дома заўважыла яго ўзнёслы настрой і асаблівую адухоўленасць.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Назаўтра Мікалай Кожух параіўся з калегамі, і супрацоўнікі ўпраўлення вырашылі ўзяць шэфства над гэтым домам. Скажам, сшыткі, ручкі набыць да навучальнага года альбо нейкі дробны рамонт правесці ў доме. Усе згадзіліся.

Дом вялікі. Яго пабудавалі на спонсарскія грошы ў рамках акцыі «Нашы дзеці». Пра гэта нагадаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар падчас адкрыцця дома. Губернатар падкрэсліў, што на Брэстчыне пабудаваны 24 такія дамы, адкрылі 25-ы, на чарзе — яшчэ адзін. А налета адсвяткуюць наваселле падобныя ўстановы ў Брэсце, Пінску і Століне. Зноў дзеці атрымаюць сем'і ў падарунак.

А гэтай новай вялікай сям'і ўсе пажадалі шчасця. Цяпер гэта самае важнае для іх.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрын*

# ВУЖАКОЎЦЫ — ЛЮДЗІ ШЧОДРЫЯ!

## Як святкуюць год Змяі і Каляды ў беларускай вёсцы Ужанка


Творчы дуэт: Людміла ГУЛЕНКА і Любоў ДРЫК.

**НАШЫ продкі шанавалі і аберагалі гэтую істоту. Як сведчаць паданні, раней людзі трымалі вужа ў хаце пад печкай. І калі наступаў час палуднаваць (а ў вялікіх сем'ях дзяцей кармілі асобна ад дарослых, пасадзіўшы іх на падлозе вакол вялікай міскі са стравою), вуж выпаўзаў з-пад прыпечка і месціўся побач з імі. Бывала, што тыя яго адганялі, білі лыжкай па галаве, але жывёліна не крыўдзілася. Для вужакі пакідалі ненакрыты глечык малака, каб той мог падсілкавацца ў любы час. Не супраць былі гаспадары, каб істота жыла ў хляве і нават смактала ў каровы малако. Рагуля прывыкала да «суседа» і пачынала трывожыцца ў яго адсутнасць. Вуж, як лічылі нашы прашчуры, ахоўваў дом і гаспадарку, знішчаў дробных грызуноў, адводзіў няшчасце ад сям'і. Калі летнім днём ён выпаўзаў за вароты «прагуляцца» і доўга не вяртаўся, то гаспадары вельмі хваляваліся, думалі, што, можа, незнарок пакрыўдзілі паўзуна. Як сведчыць паданне, ў Мядзельскім раёне вуж пакінуў падворак, а праз нейкі час сярод яснага дня на небе з'явіліся хмары і бліскавіца спаліла хату. Цікава, што ў казачных сюжэтах вуж практычна адсутнічае. Магчыма, існавала нейкая забарона на прыніжэнне яго вобразу, у адрозненне ад ваўка, мядзведзя, лісіцы ды іншых звяроў. У Беларусі знайшлася толькі адна вёска, якая сваім паходжаннем удзячная гэтай добрай істоце...**

### АД ПРАДЗЕДАЎ І ПРАБАБУЛЬ

Ужанка знаходзіцца ў Нясвіжскім раёне, непадалёку ад пасёлка Гарадзея. У кнізе «Памяць. Нясвіжскі раён» гаворыцца, што вёска вядомая з XVI стагоддзя. У 1560 годзе князю Мікалаю Радзівілу зроблена даніна на дзве валокі зямлі на Ужанцы. У 1564-м князь перадаў вёску ў Навагрудскім ваяводстве Вялікага Княства Літоўскага (18 валок зямлі) ва ўладанне іезуітаў. У 1853 г., паводле «Вандровак» Уладзіслава Сыракомлі, ва Ужанцы меўся касцёл, які, на жаль, не захаваўся.

У 1870 годзе існавала дзве Ужанкі: Вялікая і Малая, а ў 1966 годзе яны аб'ядналіся ў адну вёску. Сёння Ужанка — гэта даволі вялікі населены пункт, дзе налічваецца больш за 130 гаспадарак і пражывае 328 чалавек.

Якім было паселішча ў мінулым, звестак няшмат. Скупыя факты можна пачарпнуць, бадай, толькі ў архіўных матэрыялах. Але ёсць і іншыя крыніцы — успаміны старажылаў, якіх сёння ўжо няма ў жывых. Яны падзяліліся сваімі ўражаннямі, а таксама тым, што чулі ад сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў, з мясцовым бібліятэкарам Людмілай Гуленкай, а Людміла Казіміраўна гэтыя звесткі старанна занатавала.

— Мясцовы жыхар Сямён Баўтрэль, 1898 года нараджэння, пражыў 102 гады. Менавіта ён і расказаў мне, што назва вёскі паходзіць ад слова «вуж». Калісьці тут была парослая хмызняком зямля ў аблогах балот. У хмызняку вялося шмат вужоў. У тыя часы тэрыторыю засялялі прыезджыя людзі. І калі яны сталі апрацоўваць зямлю, будавацца, то задумаліся: як назваць вёску. Хтосьці прапанаваў: няхай будзе Ужанка, — распавяла Людміла Казіміраўна. — Выгляд хат быў непрывабны: без падлогі, нізкая столь. Шляхецкія адрозніваліся толькі прызбамі. У той час у вёсцы жыў небагаты пан Ігнась Бародзіч са сваёй жонкай Эляй. У адрозненне ад іншых, жорсткіх памешчыкаў, ён быў някепскі. Жонка Ігнася была высокая, надзвычай прыгожая жанчына. Іх сядзіба знаходзілася каля касцёла і выглядала вельмі дагледжанай: мноства кветак, цудоўны сад, у загоне гуляла «паўліна» — жар-птушка. Пан трымаў яе для прыгажосці і не дазваляў блізка падыходзіць. У святы, калі людзі ішлі да касцёла, пані Эля ўсцілала дарожку кветкамі.

Капліца Маці Божай Вастрабрамскай будавалася як пахавальная, пра што сведчыць склеп, на якім дата пахавання датуецца яшчэ 1814 годам. У савецкія часы капліцу пераставалі пад склад угнаенняў. Але ў 90-я гады мінулага стагоддзя яе рэканструявалі і асвяцілі ў гонар абраза Маці Божай Вастрабрамскай. Зараз тут зноў праходзяць службы, прыязджае ксёндз, адпраўляе імшу, спявадзе вернікаў.


Капліца Божай Маці Вастрабрамскай.

Уцалела і стайня з чырвонай цэглы, пабудаваная ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Кажуць, пан быў добры гаспадар, меў 300 гектараў зямлі і 60 гектараў лесу, які да сённяшняга часу называецца Бародзічаў. У тэрмін плаціў грошы работнікам — па два злотыя кожнаму ў канцы працоўнага дня, а пані Эля налівала яшчэ і па кілішку гарэлкі. А калі бачыла, што ў кагосьці няма добрага адзення, то давала адрэзы тканіны. На работу людзей забіраў панскі эканом. Касцоў ён звычайна раздзяляў на дзве групы па 10 чалавек: пакуль адны косяць, другія адпачываюць. Згадвалі старажылы і такі выпадак. Аднойчы чалавек, які пасвіў панскіх кароў, заснуў, і жывёліны зайшлі ў агарод селяніна. Гаспадар пайшоў да пана скардзіцца, і той папрасіў у яго прабачэння. Закон у тутэйшых мясцінах быў адзіны для ўсіх: багатых і бедных.

### НЕ СХАВАЕШСЯ НІДЗЕ!

У тыя далёкія часы мясцовы люд не толькі шмат працаваў, але і ўмеў адпачываць. Вольны час надараўся зімой, калі былі завершаны работы ў полі. Дзяўчаты збіраліся на вячоркі ў адной хаце, пралі кудзелю, ткалі. Зімой, на Уласа, ладзілі розныя гульні, спявалі, танцавалі, каталіся на конях, адзначалі Каляды.

— А якія сённяшнія вужакоўцы? Ці працягваюць традыцыі сваіх продкаў? — пацікавілася ў загадчыцы мясцовага Дома культуры Любові Дрык.

— Карэнных насельнікаў засталося нямнога. Старыя паміраюць, іх дамы купляюць прыезджыя. Тут выдатныя мясціны для пражывання — прыгожая прырода, чыстае паветра. Ды і з працай няма праблем. Побач — Гарадзея, Нясвіж, Стоўбцы... Да Мінска таксама можна дабрацца за пару гадзін. Але магу сказаць дакладна адно: цяперашнія жыхары таксама могуць і любяць весяліцца.

Пасля сустрэчы Новага года за сямейным сталом, звычайна а другой гадзіне ночы ў Доме культуры збіраюцца і маладыя, і пажылыя, каб павіншаваць адзін аднаго, паўдзельнічаць у забаўляльнай праграме. Раней напярэдадні свята ладзілі дзіцячы ранішнік. Любоў Аляксееўна не можа стрымаць усмешку, калі ўзгадвае, як аднойчы завітала на ранішнік 80-гадовая бабуля і прачытала верш Дзеду Марозу, каб той даў ёй падарунак. Цяпер жа дзяцей возяць на ёлку ў пасёлак Ударны — цэнтральную сядзібу эксперыментальнай базы «Бурачнае», куды ўваходзіць і Ужанка.

У населеным пункце няма сваёй школы, але дзетак тут шмат. «Надта актыўныя, разумныя, многія праяўляюць схільнасць да творчасці, у прыватнасці, да музыкі, — радуецца Любоў Дрык. — Спадзяюся, што з цягам часу будуць у нас свае баяністы, якія раней меліся амаль ці не ў кожнай хаце, а цяпер — у дэфіцыце.

Музычную школу наведваюць дачушка і двое сыноў Любові Аляксееўны, ахвотна яны ўдзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці. Пры Доме культуры створана вакальная група «Вужаначкі», дзіцячая вакальная група «Карамелькі», гурток дэкаратыўна-прыкладной творчасці, аб'яднанне «Гаспадыня». Сюды з задавальненнем прыходзяць мясцовыя жанчыны, каб пагутарыць, параіцца, падзяліцца новымі рэцэптамі. Сёлета пасля заканчэння каледжа ў Дом культуры прыйшоў малады спецыяліст Віктар Шыманскі. Мастацкі кіраўнік, рэжысёр, ён арганізаваў тут тэатр мініяцюр.

— Вужакоўцы заўсёды пры справе, любяць добра папрацаваць, а збіраюцца разам — весяліцца ад душы.

Напярэдадні Новага года ў вёсцы адбыўся справаздачны канцэрт. Толькі і чуваць паўсюль — у мясцовай краме, на аўтобусным прыпынку — што сёлетняя праграма надта цікавая, а называлася яна «Ад людзей на вёсцы не схаваешся».

— Так, не схаваешся, пра ўсё даведаюцца..., — усміхаецца Любоў Дрык. — Мы нічога не прыдумлялі, паказвалі вясковае жыццё ў мініяцюрах, без фарбаў, так, як яно ёсць.

Мясцовыя самадзейныя артысты збіраюцца таксама павіншаваць сваіх землякоў з калядамі: будуць святочныя прадстаўленні, міні-спектаклі. Летась, кажуць, у адной хаце не гарэла святло, і калядоўнікі не адважыліся турбаваць гаспадароў. Вельмі ж тыя пакрыўдзіліся: чаму не разбудзілі?! Сёлета ўжо паступіла шмат калядных запрашэнняў. А вужакоўцы — людзі шчодрыя, адорваюць жаданых гасцей усім, чым багатыя: хто салам, а хто і хатняй каўбаскай.

### «ЗЯЛЁНЫ СВЕТ» ДРЭННАМУ НЕ НАВУЧЫЦЬ

А яшчэ вяскоўцы расказалі, што з іх вёскі выйшла шмат працавітых сумленных людзей, якіх усе шануюць і паважаюць. У прыватнасці, Ігар Семяновіч працуе на Стаўбцоўскім філіяле Мінскага маторнага завода. Нядаўна малады токар быў удастоены гонару паставіць свой подпіс пад зваротам да нашчадкаў, капсулу з якім заклалі ў фундамент будучай сучаснай вытворчасці чыгуннага ліцця.

Пры сельскай бібліятэцы на працягу 15 гадоў дзейнічае экалагічнае аб'яднанне «Зялёны свет». Яго арганізавала і вядзе Людміла Гуленка. Сёння тут займаецца чатырнаццаць дзяцей. Шмат іх прайшло праз рукі Людмілы Казіміраўны, але яна памятае ўсіх пайменна. Бацькі сённяшніх выхаванцаў разам з ёю заклалі каля бібліятэкі ўнікальны сквер для адпачынку. Тут растуць чырвоная рабіна, хвоя, піхта, маньчжурскі арэх, абляпіха, шарападобная і ніцая вярба, каштаны і нават пальма.

Мясцовыя насельнікі, дарэчы, нягледзячы на электронныя носьбіты інфармацыі, надта любяць чытаць кнігі. За год бібліятэку наведвае каля 700 карыстальнікаў, якія прачытваюць звыш 12 тысяч выданняў. Акрамя таго, Людміла Казіміраўна і сама дастаўляе кнігі па заказе на дом, — як правіла, пажылым людзям, і вельмі ганарыцца, што ў яе ёсць чытачы, якім ужо за 80 гадоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*Нясвіжскі раён.*

---

**Таццяна Леммер, загадчыца крамы «Мяско» г. Беразіно:**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**— У нашай сям'і летась перажыванне было: старэйшая дачка заканчвала школу, марыла пра Мінскі медыцынскі каледж. Але ж мы ведалі, што паступіць туды досыць складана. Таму рыхтаваліся да таго, што за вучобу давядзецца плаціць, прычым немалыя грошы. Прыкідвалі, як будзем выкручвацца, на чым эканоміць. А яна ўзяла і паступіла — на бюджэтнае... Гэта быў такі падарунак!..**

**А наогул, шчасце, што побач са мною муж, што растуць нашы дочкі, што, дзякаваць Богу, жывыя-здаровыя бацькі. Яны ў мяне шчырыя працаўнікі. Жывуць непадалёк, у прыгожай вёсачцы Божына, трымаюць яшчэ кароўку, свіней, птушку... Дапамагаюць і мне, і сястры. А мы, вядома ж, стараемся дапамагаць ім.**

**Тым, напэўна, людзі і моцныя?**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1. Трактор № 227, 1999 года выпуска, гос. номер 1073БЯ, начальная стоимость – 43 000 000 рублей.**<br>**Лот № 2. Трактор № 224, 1999 года выпуска, гос. номер 1074БЯ, начальная стоимость – 43 000 000 рублей.**<br>**Лот № 3. Трактор № 225, 1999 года выпуска, гос. номер 1075БЯ, начальная стоимость – 41 000 000 рублей.**<br>**Лот № 4. Токарный станок SN 402 инв. № 107, 1990 г.в., начальная стоимость – 32 000 000 рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | **ОАО«Чашникский льнозавод»** |
| Местонахождение (адрес) имущества | **ул. Луночарского, 117, г. Чашники** |
| Информация об обременениях | **Арест хозяйственным судом Витебской области** |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **г. Витебск, ул. «Правды», 32<br>24 января 2013 года в 11.00** |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск,<br>ул. Правды, д. 32, каб. 316<br>http:// vitebsk.court.by/<br>Судебный исполнитель<br>**Коржов Алексей Игоревич,<br>тел./факс: (80212) 49-13-47,<br>(8-029) 366-40-10**<br>Старший судебный исполнитель<br>Зуев Михаил Евгеньевич,<br>тел. (80212) 49-13-40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) **не позднее 23.01.2013** на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

*Руководствуясь ст. 57 Закона «О хозяйственных обществах»,*
**ОАО «Белхозторг»**
**сообщает о заключении 29 декабря 2012 г. договоров, являющимися сделками с аффиллированным лицом.**

Информация о сделках:

Стороны сделки: ОАО «Белхозторг» и ООО «Стандарт Чистоты».

Предмет сделки: аренда складских помещений и аренды оборудования, установленного на арендуемых складских площадях.

Критерий заинтересованности аффилированного лица — ООО «Стандарт Чистоты» владеет более чем 20% долей в уставном фонде ОАО «Белхозторг».

*Наблюдательный совет ОАО «Белхозторг».*

УНП 100230626

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1. Автомобиль ИЖ 27175 2008 г.в., гос. № АВ4390-2, первоначальная стоимость – 23 257 000 рублей.**<br>**Лот № 2. Автомобиль ВАЗ 21310 2008 г.в., гос. № 2140 ВИ-2, первоначальная стоимость – 60 181 000 рублей.**<br>**Лот № 3. Молоковоз ГАЗ 3309 2008 г.в., гос. № АВ 5790-2, первоначальная стоимость – 113 971 000 рублей.**<br>**Лот № 4. Измельчитель-смеситель раздатчик (кормораздатчик ИСКР-12Г «Хозяин»), первоначальная стоимость – 191 396 000 рублей.**<br>**Лот № 5. Плуг оборотный ППО-5-40, 2005 г.в., первоначальная стоимость – 50 347 000 рублей.**<br>**Лот №6. Молокоохладитель УМ-4/2 2008 г.в., первоначальная стоимость – 121 382 000 рублей.**<br>**Лот №7. Молокоохладитель УМ-4/2 2008 г.в., первоначальная стоимость – 121 382 000 рублей.**<br>**Лот № 8. Ёмкость аккумуляционная КЮМЖ 435М 2008 г.в., первоначальная стоимость – 6 828 000 рублей.**<br>**Лот № 9. Ёмкость аккумуляционная КЮМЖ 435М 2008 г.в., первоначальная стоимость – 6 828 000 рублей.**<br>**Лот № 10. Инъектор NK 27, инв. № 0000000029, первоначальная стоимость – 39 691 000 рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | **ОАО«Чашникский агросервис»** |
| Местонахождение (адрес) имущества | **ул. Ленинская 137,<br>г. Чашники** |
| Информация об обременениях | **Арест хозяйственным судом Витебской области** |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **г. Витебск, ул. «Правды», 32<br>29 января 2013 года в 11.00** |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г.Витебск,<br>ул. «Правды», д. 32, каб. 316<br>http:// vitebsk.court.by/<br>Судебный исполнитель<br>**Коржов Алексей Игоревич,<br>тел./факс: (80212) 49-13-47,<br>(8-029) 366-40-10.**<br>Старший судебный исполнитель<br>Зуев Михаил Евгеньевич,<br>тел. (80212) 49-13-40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) **не позднее 28.01.2013** на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

**Открытое акционерное общество «Миноблавтотранс»**
**филиал «Автобусный парк № 4»**
**(организатор аукциона и продавец)**

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ СНИЖЕНА НА 20 ПРОЦЕНТОВ

**одним лотом объекта недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Мядельский р-н, г.п. Свирь, улица Советская, д. 15 в составе:**

здание автокассы Свирь (инв. № 633/С-10404), об. пл. 43,6 кв. м (здание одноэтажное, стены кирпичные, перекрытия железобетонные).

**Начальная цена с НДС — 23 193 430 бел. руб.**

**Земельный участок пл. — 0,0821 га.**

Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012125441010 ЦБУ № 504 ОАО «БПС-Сбербанк» в г. Молодечно, БИК 153001369, УНП 601070223 филиал «Автобусный парк № 4» ОАО «Миноблавтотранс».

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и публикацией объявления в СМИ.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформление участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных **на сайте ОАО «Миноблавтотранс» www.minoblavtotrans.by (раздел новости).**

Аукцион состоится **06.02.2013 в 14.00** по адресу: г. Молодечно, ул. Великосельская, 38. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 05.02.2013 г. до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 294 13 95, (80176) 77 82 10.**

Закрытое акционерное общество «КапиталАктив» (зарегистрировано решением Гомельского облисполкома от 15.06.2001 г. № 440 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 4004335921, УНП 400435921, место нахождения: Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Ленина, 10, оф. 1210) реорганизуется путем выделения из ЗАО «КапиталАктив» ООО «Триактивград».

Закрытое акционерное общество «КапиталАктив» уведомляет кредиторов об уменьшении уставного фонда.

Претензии принимаются по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Ленина, 10, оф. 1210 в десятидневный срок с момента опубликования объявления.

УНП 400435921

16 января 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 09.01.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров.

УНП 200050191

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**«Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»**

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республики Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 89, кор. 2, пом. 10, каб. 18, 41. ***Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.***

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства были построены следующие объекты:

в 2010 году

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске

в 2011 году:

жилой дом № 37А по ул. Бумажкова в г. Минске, жилой дом № 10 по ул. Новиниленская в г. Минске;

в 2012 году:

жилой дом № 31А по ул. Карвата в г. Минске.

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства** – исполнение условий договора № 89-Д от 23 февраля 2012 года, заключенного с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства двух 19-этажных многоквартирных домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале ул. Ржавецкой – ул. Проектируемая № 1 – ул. Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий.

Начало строительства – декабрь 2012 года, окончание строительства – апрель 2014 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 503-60\12 от 21.08.2012 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 2426 от 03 августа 2012 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/726-9995 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006166, расположенный по адресу: г. Минск, квартал улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий, площадью 0,9303 га для строительства объекта «Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ Инспекции Департамента по надзору и контролю за строительством по г. Минску № 2-209Ж-050/12 от 27.12.2012 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда №-60-10-2012-Л от 19.10.2012 г.

Проектом предусматривается размещение на площадке в квартале улиц Ржавецкая – Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 двух 20-этажных 144-квартирных жилых домов № 1 и № 2 по генплану, открытых автомобильных парковок общей вместимостью 149 машино-мест с местами для машин маломобильных групп населения, двух детских площадок, двух площадок для отдыха. Проектом предусмотрено строительство объекта в 2 этапа: 1 этап: жилой дом № 2 по генплану и наружные инженерные сети к нему; 2 этап: жилой дом № 1 по генплану и наружные инженерные сети к нему. В подвале и на 1 этаже расположены встроенные помещения общественного назначения, помещение кондоминимума. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка – декоративная рельефная штукатурка с покраской фасадными красками, облицовка плиткой из вибропрессованного бетона. Оконные блоки – стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку. Секция оборудована двумя лифтами, мусоропроводом.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность, входят помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц однокомнатные, двухкомнатные, трехкомнатные, четырехкомнатные и пятикомнатные квартиры в жилом доме № 2 по генплану:**

При 100% оплате стоимости квартиры в течение 5 календарных дней с даты подписания договора долевого строительства стоимость **1 м² 1100 долларов США.**

При оплате в рассрочку стоимость **1 м² 1-, 2-комнатных квартир 1300 долларов США, 3-, 4-, 5-комнатных квартир 1200 долларов США**. Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир**, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, проспект Победителей, д. 89, кор. 2, помещение 10, каб. 1. ***Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8(029)708 46 64.* Официальный сайт www.airon.by**

■ Старыя рэчы

# ЁЛАЧНЫЯ ЦАЦКІ — ГІСТОРЫЯ Ў ФІГУРКАХ

**Традыцыя прыбіраць хваёвае дрэва налічвае каля шасці стагоддзяў. У Еўропе новага часу ёлку ўпрыгожвалі амаль гэтак жа, як і зараз: на верхавіне красавалася віфлеемская зорка, на галінкі вешаліся яблыкі (зараз шары), якія ўвасаблялі біблейскі забаронены плод, свечкі. Таксама на ёлку вешалі арэхі, прысмакі і фрукты.**

Першая ў Расійскай імперыі ўпрыгожаная ёлка з'явілася дзякуючы Пятру І, які выдаў указ аб святкаванні з ёй Новага года. Але з першага разу святочная ёлка ў Расіі не прыжылася: усе палічылі гэта чарговым капрызам цара, а сялянам і ўвогуле не патлумачылі, навошта гэта патрэбна. Другая спроба адбылася ў 1819 г., калі пруская прынцэса Шарлота, жонка цара Мікалая Паўлавіча, настаяла на навагоднім свяце з прыбранай ёлкай. З тых часоў традыцыя ўпрыгожваць ёлку пачала развівацца ў Расійскай імперыі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі каляндную ёлку строга забаранілі, таму купіць хваёвае дрэва стала немагчыма, а прывезці з лесу — небяспечна; завоз цацак з Германіі спыніўся. Нягледзячы на гэта, некаторыя людзі імкнуліся падарыць сабе свята — менавіта ў той час стала з'яўляцца шмат самаробных ёлачных цацак.



Калі ў 1935 г. улады прынялі пастанову аб святкаванні Новага года ў СССР, выраб ёлачных цацак атрымаў новае жыццё. Напрыклад, пасля выхаду на савецкія экраны камедыі «Цырк» сталі з'яўляцца ёлачныя негрыцяняты з ваты, а пасля прэм'еры фільма «Карнавальная ноч» — цацкі для ёлкі ў форме гадзіннікаў, на якіх заўсёды было без пяці хвілін дванаццаць. У першыя гады вытворчасці аўтамабіляў «Пабеда» савецкія ёлкі ўпрыгожвалі цацачныя машынкі. Першы палёт у космас даў пачатак вырабу шкляных касманаўтаў, спутнікаў і ракет. У 1950-1960 гг. у моду ўвайшлі ёлачныя цацкі на сельскагаспадарчую тэму: памідоры, морква, снапы пшаніцы, кукуруза... Яшчэ адна тэма савецкіх цацак — казкі. Напрыклад, да юбілею А.С. Пушкіна былі выпушчаны цацкі з галоўнымі героямі яго твораў: «Казка пра рыбака і рыбку», «Руслан і Людміла».

У 1970-х гг. вытворчасць цацак паставілі на паток, таму яны сталі менш разнастайнымі і ўнікальнымі, адбыўся пераход ад якасці да колькасці. Цацкі гэтых часоў — гэта цацкі розных геаметрычных форм з немудрагелістым роспісам.

У Беларусі цэх па вырабе ёлачных цацак быў створаны ў 1946 годзе. Пажылыя людзі кажуць, што мінскія цацкі адрозніваліся высокай якасцю і былі вельмі прыгожымі. Але нават у свае лепшыя часы самастойным прадпрыемствам цэх не стаў. Адбылося гэта толькі ў 1992 годзе. Доўгі час прадпрыемства змагалася з цяжкімі ўмовамі сучаснага рынку, але, на жаль, спыніла сваё існаванне.

### «ДЗЕДА МАРОЗА ДАЎНО НЯМА, ЯК І ТАГО МАЛЕНЬКАГА ХЛОПЧЫКА САШЫ, А ЦАЦКІ ЗАСТАЛІСЯ»

— Аляксандр Герман — малады мінчанін, па прафесіі повар, вясёлы і актыўны чалавек.

Ні адзін Новы год у хаце Аляксандра не абыходзіцца без ёлкі, упрыгожанай абавязкова старымі цацкамі:

— Мы не выкідваем савецкія ёлачныя цацкі, таму што гэта добрая памяць. Нашым цацкам больш за дваццаць гадоў, а некаторым нават больш за сорак.

— Аляксандр спадзяецца, што і праз шмат гадоў зможа паказаць сваім дзецям прыгожыя цацкі, якія размалёўваліся ўручную і не былі падобнымі адна да другой. Ён бярэ ў рукі каляровы шар, і на твары з'яўляецца ўсмешка — мабыць, нешта ўзгадаў...

Ёлачныя цацкі ў сям'і Германаў з'яўляліся паступова. У асноўным іх прывозіў бацька: ён часта ездзіў у камандзіроўкі ў Маскву і Санкт-Пецярбург. Прывозіла цацкі і маці, часцей з Польшчы.

— Цацкі ўжо старыя, фарба крыху пацямнела, аблезла, але сваю ёлку я ўпрыгожваю толькі імі! Бяру ў рукі цацку і ўзгадваю тыя часы, калі верыў у Дзеда Мароза. Тады мне падавалася, што ён абавязкова пакладзе пад ёлачку машынку або самалёт. Дзеда Мароза даўно няма, як і таго маленькага хлопчыка Сашы, а цацкі засталіся.

**Любоў БЯЛЯЕВА**

## УНІКАЛЬНАЯ СПАРТЗАЛА

**Гамяльчане атрымалі новую спартыўную залу «Лакаматыў». Падарунак для жыхароў паўмільённага горада зрабіла Беларуская чыгунка. Адкрыццё вялізнага спартыўнага комплексу было прымеркавана да 150-годдзя арганізацыі.**






Аналагічнага спартыўнага аб'екта пакуль няма ў нашай краіне, адзначылі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Унікальная спартзала, пабудаваная ўсяго за год, мае плошчу больш за 7000 квадратных метраў і разлічана на 750 гледачоў. Тут плануецца праводзіць спаборніцтвы па валейболе, баскетболе і міні-футболе не толькі рэспубліканскага, але і міжнароднага ўзроўню. У будынку ёсць памяшканні для прэс-цэнтра, кабінет допінг-кантролю, пакоі для трэнераў... Пры будаўніцтве залы выкарыстоўваліся энергаэфектыўныя тэхналогіі. У прыватнасці, пабудавана свая кацельня, для асвятлення выкарыстоўваюцца святлодыёдныя свяцільні, усталявана энергазберагальная сістэма вентыляцыі.

Новая зала стане асноўнай трэніровачнай базай для каманды Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі па міні-футболе. Аднак сучасным спартыўным цэнтрам будуць карыстацца не толькі чыгуначнікі, але і ўсе жыхары Гомеля. Тут усталявана амаль 90 спецыяльных трэнажораў. Ёсць саўна і більярд. Прынамсі, невыпадкова, што першы сучасны комплекс пад эгідай Беларускай чыгункі адкрыты менавіта ў горадзе над Сожам. Дарэчы, якраз тут рыхтуюць кадры для многіх транспартных арганізацый, у тым ліку для чыгункі. У Гомелі знаходзяцца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту і дзяржаўныя каледж і ліцэй чыгуначнага транспарту. Студэнты гэтых устаноў таксама змогуць займацца спортам і ўмацоўваць здароўе ў новай сучаснай спартыўнай зале.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**



**Віктар ТОЗІК, намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс»:**

**— Для мяне 2012 год прайшоў без пэўных узрушэнняў. Нават не прыпомню штосьці такое, што б выбівалася са звычайнага бегу падзей. Хацелася б, каб 2013 год прайшоў без катаклізмаў — як прыродных, так і рукатворных. На жаль, летась іх здарылася ў свеце зашмат: гэта і тэхнагенныя катастрофы, і нядаўняя страляніна ў амерыканскай школе... Добра было б, каб паспахова вырашыліся матэрыяльныя і духоўныя праблемы, з якімі сутыкаюцца мае сябры і родныя. А па працы — хочацца, каб стала менш рознага кшталту здарэнняў і няштатных сітуацый. Для транспартнікаў гэта галоўная мара.**


## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер 1401000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. 28 Июля | 1027132 | 3,6204 | для строительства и обслуживания объекта торговли промышленной группой товаров | 10 | 4 480 510 535 | 896 102 000 | 2 811 113 | ограничений в использовании земель нет |
| Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» | | | | | | | | | |

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной, увеличенной на 5%, обязан:**

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881.
- в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;
- приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 12 февраля 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 08.01.2013 г. до 17.30 06.02.2013 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46 (либо ул. Ленина, 50).**

**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**



## КОНКУРСНЫЙ УПРАВЛЯЮЩИЙ ЧСТУП «БЕЛЭФФЕСТРОЙ»

**Е.А. Кудренок – организатор торгов, извещает о проведении 04 февраля 2013 г. в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8-25 открытых торгов в форме аукциона (на повыш. нач. цены) по продаже дебиторской задолженности, шаг торгов – 5% от первоначальной цены, задаток – 10% от первоначальной цены.**

| № п\п | Наименование | Начальная цена продажи (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 1 | Продажа дебиторской задолженности Маглыша Игоря Сергеевича в размере 11 736 341 рубль | 10 562 707 |

Прием заявок по адресу проведения торгов с даты настоящей публикации до 03.02.2013 г. включительно с 9.00 до 18.00, здесь же ознакомление с формой заявки, договором и др. документами и сведениями. **Тел. в г. Минске: (8029) 644 38 92.** Оплата производится с даты настоящей публикации до 03.02.2013 г. включительно на р/с 3012112960018 в ЦБУ №17 ЗАО «АКБ «БЕЛРОСБАНК», г. Минск, МФО 153001770, УНП 190453750.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения дебиторской задолженности по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в теч. 3 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в теч. 5 календ. дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 42 (171)

# ЯК БАС МІХАІЛА РЫСАВА Ў ІТАЛІЮ ПРЫВЁЎ


Міхаіл Рысаў з сынамі.

**ЯГО памятаюць у нашым оперным тэатры: Міхаіл Рысаў быў перспектыўным артыстам, калі вырашыў застацца за мяжой. І вось праз амаль чвэрць стагоддзя яго голас зноў гучаў на сцэне опернага тэатра Беларусі. І аказалася, што яго памятаюць музыканты і асобы культуры, памятае публіка — яна рада чуць голас чалавека, які гатовы спяваць на роднай сцэне. Нягледзячы на тое, што даўно жыве ў Італіі (непадалёк ад Венецыі), выступае ў спектаклях еўрапейскіх оперных тэатраў, Міхаіл Рысаў цікавіцца жыццём на радзіме, сочыць за падзеямі, акрамя расійскіх, глядзіць тэлеканал «Беларусь ТВ». Цяпер ён лічыць сябе еўрапейцам, хоць і адчувае: выхаванне нікуды не падзелася. Таму і пасля доўгіх гадоў адсутнасці ў Беларусі сам пачаў шукаць кантактаў з былымі калегамі па тэатры. Дзякуючы інтэрнэту знайшоў сайт Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі са спісам кантактаў, аднавіў былыя сувязі. І моцна ўзрадаваўся: яго не забылі, мала таго, рады бачыць...**

— Вярнуўшыся сюды пасля 24-гадовага перапынку, я адчуў добразычлівыя да сябе адносіны, нягледзячы на тое, што пасля майго ад'езду былі розныя размовы: маўляў, мы на яго спадзяваліся, а ён падвёў, з'ехаў..., — гаворыць Міхаіл. — Ці ёсць у мяне пачуццё ўдзячнасці рэспубліцы? Безумоўна, ёсць. Таму што рэспубліка мне дала непараўнальна больш, чым я ёй. У 1983 годзе я скончыў беларускую кансерваторыю. У 1984-м атрымаў першую прэмію на рэспубліканскім конкурсе выканаўцаў. А ўжо ў снежні 1984 года быў усесаюзны конкурс вакалістаў імя Глінкі ў Ерэване, на якім я атрымаў 4-ю прэмію сярод амаль 200 удзельнікаў.

Час, на які выпаў мой ад'езд, быў вельмі складаны: 1990-я гады. Перыяд, які непасрэдна папярэднічаў распаду Савецкага Саюза. Насамрэч, мне з вялікай цяжкасцю ў 1987-м удалося выехаць упершыню за мяжу — на міжнародны конкурс оперных спевакоў у бельгійскі горад Верб'е. Вырвацца атрымалася пасля таго, калі я паслаў тэрміновую тэлеграму сакратару ЦК кампартыі Беларусі Пячэннікаву. Пасля гэтай тэлеграмы мне літаральна праз два дні патэлефанавалі з сакратарыята аддзела па культуры ЦК Кампартыі Беларусі, запрасілі па гутарку і паведамілі, што пастараюцца аформіць мой выезд як мага хутчэй. На наступны дзень я быў у міністра культуры Юрыя Аляксандравіча Міхневіча (ён пад свой кантроль узяў гэтае пытанне), і літаральна праз некалькі дзён я выехаў у Бельгію, дзе атрымаў на конкурсе 2-ю прэмію. А праз два тыдні я павінен быў ехаць на стажыроўку ў «Ла Скала».

Гэтаму папярэднічаў збор вялікай колькасці дакументаў, характарыстык і г. д. Я памятаю адну медыцынскую даведку жудасных памераў. Памятаю, як тагачасны дырэктар опернага тэатра Васіль Букань праз свае асабістыя сувязі арганізаваў мне праходжанне медыцынскай камісіі праз 4-е галоўнае ўпраўленне Мінздрава. Але калі я прыйшоў да неўрапатолага, то ўрач мяне выслухала і сказала: «Я вам не магу падпісаць даведку на выезд, таму што вы моцна заікаецеся, а ў нас ёсць такое палажэнне, згодна з якім не дапускаюцца да выезду за мяжу асобы, якія сістэматычна ўжываюць алкаголь, наркатычныя рэчывы і якія пакутуюць на моцнае заіканне... Вы сваім заіканнем можаце скампраментаваць нашу краіну». І яна мне не падпісала даведку. А неўрапатолаг у той час — ці не галоўны доктар... Ужо не памятаю, як гэтая сітуацыя вырашылася, але мне ўдалося выехаць.

Калі я ехаў у Італію ўжо на другі год стажыроўкі, то перашкоды на гэты раз учыняла Міністэрства культуры СССР. Стажыроўка ў Міланскім тэатры «Ла Скала» прадугледжвала 2-гадовы курс навучання. Але па заканчэнні першага года наша група стажораў з розных рэспублік Савецкага Саюза павінна была вярнуцца ў Савецкі Саюз, прыехаць у Мінкультуры СССР і зрабіць справаздачу. Акрамя яе, я прывёз ліст дырэктара цэнтра ўдасканалення маладых оперных спевакоў пры тэатры «Ла Скала» пра тое, што мне неабходны яшчэ другі год навучання. На гэта мне чыноўнік сказаў: «Вы адзін год стажыраваліся — і хопіць, цяпер саступіце дарогу іншым»...

> **Калі я прыйшоў да неўрапатолага, то ўрач мяне выслухала і сказала: «Я вам не магу падпісаць даведку на выезд...**

**— Памятаеце момант, калі вы вырашылі, што застаецеся? Што было вырашальным?**

— Гэта спалучэнне адразу некалькіх прычын. Перш за ўсё гэта магчымасці творчага скачка, якія перада мной адкрываліся, і якасная скачка ў маім жыцці. Мы разумелі, што еўрапейскае прызнанне з'яўляецца свайго роду «знакам якасці» артыста. І трэцяе — мая пабытовая неўладкаванасць. На той момант, калі я з'язджаў на другі год стажыроўкі, у мяне тут нічога не было. Я быў у стадыі разводу з маёй другой жонкай. Мне трэба было шукаць нейкае жыллё, у мяне была невысокая зарплата, што рабіць далей, я не ведаў... Падчас італьянскай стажыроўкі я паспяхова выступіў на шэрагу конкурсаў — напрыклад, перамог на конкурсе Тоці Даль Монтэ (была такая знакамітая італьянская спявачка, каларатурнае сапрана, якая выступала з Шаляпіным). Упершыню за ўсю гісторыю гэтага конкурсу разам са сцягамі, якія паднялі над оперным тэатрам, быў чырвоны сцяг СССР — у 1989 годзе. Гэта быў першы і апошні раз, бо неўзабаве СССР распаўся. Гэты конкурс даў мне кантракт на выступленне ў пастаноўцы «Дон Жуан» у Трэвіза. Гэты кантракт мне даў грошы. Пакуль я спяваў «Дон Жуана», атрымаў кантракт на наступнае лета 1990-га на выступленне ў спектаклі «Аіда» ў Веронскай арэне. Калі б у той самы момант перада мной не адкрываліся перспектывы, я б вярнуўся ў Беларусь. А ў нашым былым савецкім консульстве ў Мілане нас, усіх стажораў «Ла Скала», трымалі пад наглядам. Усе стажоры даўно вярнуліся сюды, а я ўсё яшчэ не вяртаўся. У мяне быў квіток на самалёт з адкрытай датай, я мог паляцець у любы момант. І мяне час ад часу турбавалі з савецкага консульства: «Калі ж вы збіраецеся вярнуцца ў Савецкі Саюз?» Я казаў: «Вось у мяне канцэрт, потым будзе конкурс, пасля я вярнуся». Канчаўся конкурс, мне зноў тэлефанавалі: «Збіраеце рэчы?..»

Нягледзячы на тое, што я застаўся ў Італіі, я ніколі неператвараў мой учынак у нейкі палітычны фарс. Хачу падкрэсліць: я ніколі не прасіў палітычнага прытулку! Гады чатыры таму я выпадкова даведаўся, што нейкая маскоўская журналістка напісала кнігу «Багіня мастацтва Ірына Архіпава». Я прачытаў у ёй, што ў адным са сваіх інтэрв'ю Ірына Канстанцінаўна сказала пра мяне: «Так, быў такі бас, паехаў у Італію, папрасіў палітычнага прытулку, і больш пра яго нічога не чуваць». Ва ўсім гэтым я ўбачыў ідэалагічную падаплёку: ва ўсіх, хто здрадзіў Радзіме, няма будучыні. Я напісаў Ірыне Канстанцінаўне ліст, у якім усё патлумачыў. Не ведаю, ці дайшоў мой ліст. Мне на яго ніхто не адказаў... У тым лісце я пісаў, што ёсць шмат расійскіх і былых савецкіх спевакоў, якія ў той час выступалі за мяжой. Але ніводзін з іх не працаваў у еўрапейскіх тэатрах, як я — як свабодны прафесіянал. Яны ўсе былі вывазнымі: выязджалі з нейкім калектывам...

Я ў іншым становішчы, таму што сам праз сваіх агентаў павінен ездзіць па оперных тэатрах, спяваць праслухоўванні на агульных пачатках, стукацца ва ўсе дзверы. Ніхто нікога не запрашае насамрэч, усе прыязджаюць і стукаюцца. Вы прыязджаеце і бачыце, што за кулісамі чакаюць 26 такіх, як вы. Вы выходзіце на сцэну, называеце, якое агенцтва вас прадстаўляе, спяваеце. Вам кажуць «дзякуй». Вы сядаеце ў самалёт, ляціце дадому і чакаеце, возьмуць ці не... Насамрэч, гэта як шахматная гульня, таму што спяваюць не галасы, а імёны, спяваюць агенты. Таму што ў моцнага опернага агенцтва ёсць больш моцныя рычагі ўздзеяння на артыстычную дырэкцыю. Маленькі агент можа патэлефанаваць, дамовіцца, каб прызначылі дзень праслухоўвання, і даведацца пра вынік... Такі наш закулісны свет. У ім ёсць карупцыя і прамая, і ўскосная. Не ўсё і не ўсе карумпіруюцца за грошы. Ёсць пабочныя спосабы...

**— Беларускі тэатр прыкладна ў той жа час, што і вы, пакінула Марыя Гулегіна, якая зрабіла імя сусветнага маштабу...**

— Што тычыцца Машы Гулегінай, я думаю, што яе артыстычны лёс склаўся па-іншаму. Я стаўлюся да яе з вялікай павагай і чалавечай сімпатыяй. Мы разам з ёй паступалі ў Беларускі оперны тэатр у 1983 годзе. Адначасова спявалі праслухоўванне, і нас прынялі ў трупу. Але яна зрабіла сапраўды вялікую кар'еру! Яна, се сапрана да сённяшняга высока цаніруецца ў свеце.

**— Напэўна, шлях да самарэалізацыі мог быць і на радзіме?**

— У 1985 годзе, як лаўрэат конкурсу імя Глінкі, я паехаў на праслухоўванне ў Ленінградскі Малы дзяржаўны оперны тэатр: тут, у Мінску, я адчуваў сябе цесна. Паехаў, спеў жудасна, таму што правёў бяссонную ноч. Слухаў мяне галоўны рэжысёр і мастацкі кіраўнік Гаўдасінскі. Пасля праслухоўвання ён запрасіў мяне ў свой кабінет і сказаў, што бярэ на працу, але можа прапанаваць меншы заробак, чым у Мінску, і можа даць пакой у інтэрнаце: «Падумайце, у вас ёсць перспектыва творчага росту ў сталічным Ленінградзе ці перспектыва вярнуцца ў Мінск і з часам вырасці ў знакамітага беларускага баса». Я вярнуўся ў Мінск. Заходжу ў оперны тэатр і бачу: перад службовым уваходам на дошцы аб'яў вісіць загад дырэктара тэатра пра значнае павышэнне мне заробку. Быў 150, а тут адразу стаў 250 рублёў! А там мне Гаўдасінскі паабяцаў 100 рублёў, з якіх я яшчэ павінен быў на майго старэйшага сына выплачваць аліменты. За што б я там жыў?..

> **Нягледзячы на тое, што я застаўся ў Італіі, я ніколі не ператвараў мой учынак у нейкі палітычны фарс. Хачу падкрэсліць: я ніколі не прасіў палітычнага прытулку!**

**— І вось вы жывяце ў Італіі, а гэта вельмі музычная краіна, дзе высокая канкурэнцыя паміж артыстамі. Гэта было складанае рашэнне для вас?**

— Я лічу, што здолеў «утрымацца» ў Італіі дзякуючы адной маёй якасці — глыбокай унутранай пакорлівасці. Мая душа стаіць увесь час на каленях перад операй. Але гэтая ўнутраная пакорлівасць (якая часам дасягае самаадмаўлення) пагражала тым, што можна было лёгка страціць самога сябе, тую аснову, якую ва мне заклалі кансерваторыя і савецкая оперная культура.

Калі разважаю пра той перыяд свайго жыцця, заўсёды ўзнікае асацыяцыя двух чамаданаў. У маёй сітуацыі трэба было паехаць у Італію з двума чамаданамі — адзін у мяне быў поўны майго ўласнага вопыту — гэта мой багаж; а другі быў пусты для таго, каб нешта ўзяць там і напоўніць яго. Першыя 10 гадоў я ўсё ў сябе ўсмоктваў. У 1991 годзе, пасля таго, як спеў у «Яўгене Анегіне» ў Франкфурце, мне там прапанавалі пастаянны кантракт. Але, як творчаму чалавеку, мне гэта было нецікава, таму што я ўсё яшчэ быў улюбёны ў Італію. У 1991-м я жыў у адным з самых цудоўных італьянскіх гарадоў, прычым зняў сабе кватэру за 100 метраў ад Веронскай арэны. Пражыў там поўныя 2 гады — самыя шчаслівыя гады майго жыцця. У 1990-м дэбютаваў у Веронскай арэне, дзе спяваў кожны оперны летні сезон да 2001 года. А ўжо з 2004 года па 2010-ы выступаў на летнім опернем фестывалі ў Рыме... Маё жыццё — жыццё свабоднага мастака, прафесіянала, у якога няма ніякага пастаяннага месца працы, які не звязаны ніякімі абавязкамі, які спявае па разавых кантрактах. Гэта насамрэч шлях няпэўны, і не ўсе і не заўсёды маюць працу, маюць ангажэмент. Але якраз такая нестабільнасць, як гэта ні дзіўна, спрыяе і творчаму росту, і асабістай сталасці. Таму што чалавек, які ўсё жыццё сядзіць на пастаянным кантракце ў адным тэатры, які атрымлівае свой няхай і невялікі, але стабільны заробак, сам таго не заўважаючы, губляе самастойнасць, таму што яго прызначаюць на партыі незалежна ад таго, падыходзіць ён па голасе ці не, падабаецца яму ці не. Зусім па-іншаму ў свабодных прафесіяналаў. Мы маем права адмовіць.

**— Ці ёсць у вас у Італіі сваё атачэнне, блізкія людзі, сябры?**

— Да майго вялікага жалю, я не магу даць станоўчага адказу. Маім атачэннем была і застаецца мая сям'я. У мяне цудоўная жонка, якую я вельмі кахаю, яна італьянка. У нас двое цудоўных сыноў — Мікола і Мікіта. Старэйшаму 18 з паловай, малодшаму — 10. Абодва —музыканты. Старэйшы вучыцца на фартэпіяна ў Венецыянскай кансерваторыі, захапляецца праваслаўнымі песнапеннямі, нават «Сімвал веры» на музыку паклаў. Малодшы — на падрыхтоўчым курсе па класу скрыпкі. Але мы вырашылі ў сям'і, што ніводзін з нашых двух сыноў прафесійным музыкантам не стане. У Італіі вельмі шмат беспрацоўных музыкантаў, там вельмі складана прайсці па конкурсе і атрымаць месца. Я ведаў аднаго трамбаніста, які гандляваў у газетным кіёску, хоць увесь час ездзіў на праслухоўванні...

Што тычыцца сяброў, для мяне гэта балючае пытанне, таму што паняцце сяброўства ў італьянскай культуры — іншае, чым у нас... Але ніякая вытворчасць не бывае без страт, а творчае жыццё — гэта з нейкага пункту гледжання вытворчасць... Насамрэч сёння ўвесь свет — як адна краіна. Гэта некалі ў нас была заслона, і мы падзялялі свет на «тут» і «там». Але мы ўсе жывём у адной вялізнай культурнай прасторы і ў адным гістарычным часе. Культуру трэба ўспрымаць як нешта цэласнае. Не варта размяжоўваць людзей на нацыяналістаў і касмапалітаў (апошняе сёння гучыць вульгарна), таму што ў кожным чалавеку павінны прысутнічаць і нацыянальны складнік, і агульначалавечы, нельга гэтыя рэчы супрацьпастаўляць. Я жыву ў агульначалавечай культурнай прасторы, але пры гэтым не забываюся, адкуль паходжу.

**— Ці не шкадуеце пра сваё рашэнне?**

— Цяпер, прыехаўшы сюды, я ўявіў, як бы выглядаў Міхаіл Рысаў, калі б застаўся тут: з зывоцікам, народны артыст рэспублікі. Я сказаў сам сабе: няхай буду такім, які я ёсць. Я люблю свой лёс.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Алена Дуброўская, актрыса тэатра і кіно:



**— Летась было шмат станоўчых момантаў, якія застануцца ў памяці. Я знялася ў фільмах «Родны чалавек», «Сіла сэрца», Букет», што дазволіла паспрабаваць сябе ў новых ролях, пабываць у незвычайных месцах. З удзячнасцю хачу адзначыць, што працягваецца маё супрацоўніцтва з Ігарам Штэрнбергам, на якое я, і, спадзяюся і ў гэтым годзе. Летась таксама наш Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр адзначыў сваё 80-годдзе. Было вялікае свята, дзе кожны змог на сцэне паказаць сябе. Хочацца, каб сёлета было больш новых спектакляў. Няхай спраўдзіцца тое, што ўжо задумана і распачата. Няхай гэты год будзе яшчэ лепшым, чым мінулы. Больш радасці і пазітыву! Пакуль што не адбылося ніякіх глабальных падзей у асабістым жыцці, таму ў надышоўшым годзе чакаю перамен на гэтых прасторах. Усім зычу, каб былі здаровымі і шчаслівымі родныя і блізкія людзі.**

# БЕЛАРУСКІЯ КАЛЯДЫ Ў ВЕНЕСУЭЛЬСКІХ ТРОПІКАХ

**Каталіцкія Каляды ў Венесуэле адбываюцца без снегу, але святочнага настрою гэта не псуе. Навагодніх упрыгажэнняў у Каракасе і Барынасе не менш, чым у Мінску ці Мазыры. Пабачым, як святкуюць Каляды самі венесуэльцы, а таксама беларусы, якія там жывуць і працуюць.**


Калядная ёлка ў венесуэльскай глыбінцы (штат Барынас).

## ЯК СВЯТКУЮЦЬ ВЕНЕСУЭЛЬЦЫ

Венесуэльцы да свят не рыхтуюцца — яны ў іх жывуць. Таму ёлкі запальваюцца яшчэ ў лістападзе, а «вахта» нестамляльнага Санта Клауса доўжыцца каля дзевяноста дзён — да лютаўскіх карнавалаў. У іншых венесуэльскіх хатах і электрычныя гірлянды з вокнаў не здымаюць — адключаюць да наступных Каляд.

Вядома, елкі ў тропіках не растуць, але святочна ўпрыгожаных дрэў тут шмат. Рознакаляровымі гірляндамі аплецены нават пальмы.

Пра елкі асобна. Хатнія елкі звычайна натуральныя, іх завозяць з Канады. У грамадскіх месцах елкі штучныя, некаторыя — памерам з трохпавярховы дом.

Самыя сціплыя, дзіўныя і крэатыўныя ёлкі — у глыбінцы. Адну з такіх я пабачыў у штаце Барынас. Ёлка ўзвышалася на перакрыжаванні двух вясковых дарог. Да бліжэйшага населенага пункта — каля кіламетра. Навакол — забалочаныя палеткі з пальмамі, белымі чаплямі і... кайманамі.

Іншыя ёлкі ў Каракасе. Адна з самых буйных — на плошчы Францыя дэ Альтаміра. Знаходзіцца ёлка... у басейне. Вада з яго па вадападзе перацякае... у метро. Відовішча для паўночнага чалавека незабыўнае. Асабліва ўначы, калі струменіцца і мармыча празрыстая біруза, якая не замярзае, а ізумрудная плошча буяе сотнямі рознакаляровых ліхтароў.

Там, унізе, куды сцякае вада, — станцыя метро. У холе вядомы ўсім калядны сюжэт: Маці Боская з немаўляткам Ісусам... Папяровыя біблейскія персанажы выкананы навучэнцамі аднаго з каледжаў.

А цяпер да каляднай кулінарыі. У гэтыя дні ці не кожная хатняя гаспадыня гатуе «аяку» і «пан дэ хамон».

Першая страва — гэта фарш з ялавічыны, у якім ёсць таксама масліны, разынкі і чырвоны салодкі перац. Усе аблеплена цестам з маісавай мукі, абгорнута ў пальмавае лісце і аплецена танюсенькім шнурам. Гатуецца на пары, разаграваецца ў мікрахвалёўцы. Есці зручна нават ва ўмовах пікніка: ролю талеркі выконвае пальмавы ліст.

Другая калядная страва ўяўляе сабой даўжэзны батон, начынены вяндлінай. Некалькі гатункаў вяндліны скручваюцца ў рулет, таму «пан дэ хамон» наразаецца лёгка. Аднаго «батона» хопіць, каб пачаставаць добры тузін сяброў і калег.

Не сакрэт, Каракас — горад крымінагенны. Таму падчас свят тут узмацняецца ахова, расце колькасць патрулёў. Пабачыць сапраўднага паліцэйскага побач з цацачным Санта Клаусам — не дзіва!

## ЯК СВЯТКУЮЦЬ БЕЛАРУСЫ

Беларусы таксама пачынаюць святкаваць напярэдадні. Да прыкладу, будаўнікі з аб'екта «Фуэртэ Цівуна» наладзілі карпаратыўную вандроўку яшчэ ў сярэдзіне снежня — ездзілі да мора з начлегам.

А вось будаўнікам з аб'екта «Эль Лібертадор», што ў горадзе Пала Нэгра, пакуль не да карпаратываў. Хутка адбудзецца здача першых 320 кватэр, таму нават у выхадныя тут віруе працоўнае жыццё. Венесуэльцы разгублены: беларусы заўзята працуюць нават у перадсвяточныя дні! Анягож — на іспанскую мову «суботнік» і «нядзельнік» не перакладзеш!

Большасць беларусаў у Венесуэле — будаўнікі. Іх тут каля паўтысячы чалавек. На перыяд навагодніх канікулаў ім прадастаўляецца некалькі дзён адпачынку, які аплачваецца. Самых лепшых чакае кароткатэрміновае спатканне з радзімай.

Як паведаміў гендырэктар прадпрыемства «Белзамежбуд» Віталь Бандарык, «тым, хто добрасумленна і плённа працаваў, а таксама не меў службовых нараканняў, у якасці заахвочвання мы купляем авіябілет у два бакі — няхай людзі злятаюць да сваіх сем'яў, пабачацца з блізкімі і сябрамі».

Тыя ж з беларусаў, хто вырашыў святкаваць у Венесуэле, таксама рыхтуюцца да вандровак. Адны паедуць на ўзбярэжжа Карыбскага мора, другія — у горы, да вадаспадаў. (Дарэчы, адзін з іх — Сан-Анхель — з'яўляецца найвышэйшым у свеце: даўжыня шматтоннага воднага струменя складае каля кіламетра.)

Работа ў Венесуэле ў беларусаў надта напружаная, часам доўжыцца ўвесь светлавы дзень. Таму адпачынак на радзіме не перашкодзіць. Людзі вернуцца назад быццам аднооўленымі. Бо, хаця Венесуэла і цёплы край, Беларусь — цяплейшая. Нават у калядныя маразы.

**Андрэй СМІРНОЎ, фота аўтара і таварыства «Белзамежбуд».**

*Каракас — Мінск, спецыяльна для «Звязды».*


Калядны сюжэт у каракаскім метро.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Атрымаеце шмат інфармацыі, з якой будзе складана вылучыць галоўнае. Вы можаце спракаваць канфліктную сітуацыю з калегамі па працы, хоць гэта зараз зусім не патрэбна. Пачынаючы з аўторка, зможаце лёгка справіцца з назапашанымі дробнымі справамі. Пастарайцеся не ўцягваць старонніх людзей у свае сямейныя праблемы.

**ЦЯЛЕЦ.** У панядзелак адпачніце ад мітусні і клопатаў, не пашкадуйце часу на сябе. Ваша сур'ёзнае і добрасумленнае стаўленне да працы ўжо дакладна не застанецца незаўважаным. Можа паступіць вельмі цікавая і сур'ёзная прапанова, якая павысіць ваш аўтарытэт. Наступае спрыяльны момант для канкрэтных дзеянняў, адказных крокаў і іншых лёсавызначальных прадпрыемстваў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Не спрабуйце вырашаць усё з дапамогай сілы і не перабольшвайце значэнне волі, бо гэтым вы толькі нажывяце сабе ворагаў. Затое ўспрымальнасць і гнуткасць дазволяць знайсці сапраўдных аднадумцаў. У сярэдзіне тыдня вы можаце аказацца перад неабходнасцю выбару. Дзейнічайце спакойна, разумна і без спешкі.

**РАК.** Усё ідзе добра, калі не лічыць адной зусім нязначнай, але вельмі непрыемнай перашкоды, і імя ёй — лянота. Калі здолееце яе пераадолець, то ўсё будзе выдатна. Прапануйце начальству свае ідэі, планы і праекты. Яны рэалістычныя, а значыць, хутка ўвасобяцца ў жыцці. Імкніцеся адкрываць для сябе штосьці новае, тады адчуеце, што сталі мудрэй.

**ЛЕЎ.** Вы поўныя сіл і рашучасці, нястрымнае імкненне наперад дазваляе разбураць усе перашкоды на сваім шляху. Атрымаецца зрабіць практычна ўсё, за што б вы ні браліся. Цяжкасці, якія ўзніклі на пачатку тыдня, не стануць перашкодай для праявы прафесіяналізму, а вось з упартасцю давядзецца змагацца сур'ёзна. Паспрабуйце захоўваць добрыя адносіны з начальствам, бо ад яго можа залежаць вырашэнне адразу некалькіх вашых праблем..

**ДЗЕВА.** Тыдзень неардынарны і творчы. Калі вы запланавалі падарожжа, то яно будзе багата на ўражанні і падзеі. Самы спрыяльны дзень — нядзеля. Усю першую палову тыдня фартуна будзе ўсміхацца вам. На працы, ды і наогул у дзелавых адносінах, магчымыя перспектыўныя прапановы ад далёкіх партнёраў, а таксама доўгачаканы прыбытак. Будзьце ўважлівымі пры афармленні фінансавых дакументаў. На гэтым тыдні ёсць шанц шмат чаго дамагчыся і дасягнуць.

**ШАЛІ.** Калі ваш адпачынак паспеў ужо скончыцца ці, наадварот, яшчэ і не думаў пачынацца, то ўсю вашу ўвагу неабходна засяродзіць выключна на пытаннях, звязаных з працай. Пры гэтым пажадана прысвячаць сілы і час толькі тым задачам, якія вы ўстане вырашыць. Паспрабуйце на гэтым тыдні не фарсіраваць падзеі, дазвольце ім ісці сваім парадкам. І тады засяроджанасць і шпаркасць рэакцыі дазволяць справіцца з пастаўленымі задачамі.

**СКАРПІЕН.** Тыдзень прамільгне нібы ў калейдаскопе: змяненне вашых планаў — як асабістых, так і ў службовых справах. У аўторак збярыцеся з сіламі для новай справы, якую распачнiце ў сераду. Калі нешта не будзе атрымлівацца, паспрабуйце не ісці напралом, адкладзіце яе на некалькі дзён. Чым менш вы будзеце гаварыць услых аб сваіх намерах і планах, тым хутчэй яны ажыццявяцца.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні ўпэўненасць ва ўласных сілах і аптымізм дапамогуць заваяваць прыхільнасць навакольных і ўмацаваць адносіны з начальствам. Самымі спрыяльнымі днямі абяцаюць быць серада і пятніца. На працы можна смела разлічваць на добразычлівасць і разуменне калег, а таксама, калі з'явіцца неабходнасць, — на падтрымку сяброў. Можаце істотна абнавіць свае веды, тым самым скокнуўшы на новую прыступку.

**КАЗЯРОГ.** Чакаюцца ўдалыя сустрэчы з важнымі людзьмі, ад якіх будзе залежаць лёс вашых праектаў. Цалкам могуць наладзіцца адносіны з дзецьмі і суседзямі. Наступае спрыяльны час для набыцця ведаў, прычым у любой галіне — ад кулінарыі да эзатэрыкі. Але памятайце, што прыгоды бываюць не толькі цікавымі, але і небяспечнымі.

**ВАДАЛЕЙ.** З'явіцца неабходнасць засяродзіць свае сілы на вырашэнні фінансавых пытанняў. Магчымы складаныя, заблытаныя камбінацыі, у якіх вам давядзецца не толькі праяўляць самастойнасць, але і знаходзіць агульную мову з партнёрамі па бізнесе. Апошнія могуць прад'яўляць шмат матэрыяльных прэтэнзій. Прыйдзецца лавіраваць, каб адстаяць свае фінансы, становішча і незалежнасць. Дома верагодныя праблемы з дзецьмі, асабліва з падлеткамі.

**РЫБЫ.** Трэба ствараць трывалы і надзейны падмурак для спрыяльных умоў працы і творчасці. «Акунанне» ў працу павінна быць камфортным, без рэзкіх рухаў і моцных узрушэнняў. Калі нешта не атрымліваецца адразу, не хвалюйцеся: хутка з усім справіцеся і зможаце адпачыць. Да пятніцы скончацца цяжкасці і перажыванні, а вы зможаце атрымаць асалоду ад выкананай працы і яе прыемных наступстваў.

## Суботнік з Дожыкам



Рубрыку вядзе Дунька ШЫП.

### АНЕКДОТЫ З-ПАД ЁЛКІ

— Алё, гэта страхавая кампанія? Скажыце, мы можам застрахаваць дом па тэлефоне?

— Не, гэта немагчыма. Але зараз да вас прыедзе наш прадстаўнік і заключыць з вамі дамову.

— Добра. Толькі хутчэй, бо ёлка ў нас ужо дагарае.

***

*— Як табе не сорамна: пад самы Новы год сысці ў канвярню і не вярнуцца. Я ўсю ноч вачэй не заплюшчыла!*

*— А ты думаеш, я заплюшчыў?*

### Працаўладкаванне

Патрабуюцца Дзед Мароз і Снягурка для работы па зменным графіку: 1 дзень — працоўны, 364 — выхадныя.

### Прыкмета

Як Новы год сустрэнеш — так табе і трэба!

### Аб'ява на ёлачным кірмашы

Пакупнік, памятай! У каго дома стаіць штучная ёлка, да таго прыйдзе несапраўдны Дзед Мароз з фальшывым падарункам!




### НАВАГОДНЯЕ МЕНЮ

1. Аўсянка «Сэр».
2. Пельмені ручной лепкі (скульптар невядомы).
3. Катлеты паравыя (качагар дадаецца).
4. Рыльца ва ўласным пуху.
5. Яечня «Зязюліны слёзы».
6. Бульба «фры» і бульба «фо».
7. Торт арэхавы (у шалупінні).
8. Кольца заварное (з аметыстам).
9. Гарбуз абабраны.
10. Збіцень «Месершміт» (па-нямецку).

P. S. Ананасы ў шампанскім — няма (не пралезлі ў бутэльку).

**Жан ПАКЛЯК,** *г. Мінск.*

## УСМЕШКІ

### ШЧАСЛІЎЧЫК

Размаўляюць два супрацоўнікі.

— Шанцуе нашаму Мікалаю Адамавічу!

— Чаму?

— Ды жыве на ўсім гатовенькім: раней быў начальнікам, цяпер — у турме.

### РАБІ, ЯК Я...

— Цябе муж так прыбірае! — з захапленнем гаворыць адна маладзіца другой. — А ў майго нічога не выпрасіш...

— А калі ты просіш?

— Днём, безумоўна.

— А ты ноччу прасі...

### ВЕТЛІВАСЦЬ

Званок у дзверы. На парозе сантэхнік — ледзь на нагах трымаецца.

— Вы мяне выклікалі тры дні таму, — удакладняе ў гаспадыні. — Дык я зайшоў сказаць, што і сёння да вас не прыйду...

### ПРЫЧЫНА

Размаўляюць два знаёмыя:

— Чуў, што ты дрэнна з жонкай жывеш, што крыўдзіць яна цябе, — спачувае адзін знаёмец другому. — Дык чаму на развод не падаеш?

— Жонкі баюся...

**Даслаў Міхась СЛІВА,** *г. Рагачоў.*



# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СВЯТЫ ВЕЧАР

## КАЛЯДНЫ СТОЛ

**Калядная трапеза адрозніваецца ад звычайнага святочнага застолля і рыхтуецца ў адпаведнасці з векавымі традыцыямі. Лічыцца, што на калядным стале абавязкова павінны быць такія стравы: бліны, рыба, халадзец, заліўное, смажаная курыца ці гусь, малочнае парася, свіная галава з хрэнам, смажаніна, хатняя каўбаса, калядкі, перапечкі з макам і мёдам, мядовыя пернікі. Складана? Вядома, мала хто будзе гатаваць малочнае парася або свіную галаву, але ўжо куцця, калядны гусь і хатняя каўбаса цалкам па сілах любому кулінару.**

### КУЦЦЯ



**Спатрэбіцца:** ***1 шклянка зерня пшаніцы, 50—100 г разынак, 50—100 г кургі, 50—100 г чарнасліву, 50—100 г маку, 50—100 г арэхаў (можна некалькі відаў), 3—5 ст.л. мёду.***

Колькасць сухафруктаў і арэхаў вызначце на смак. Папярэдне прамыйце і распарце ў кіпені разынкі, чарнасліў і курагу. Замачыце арэхі і мак. Пшаніцу перабярыце, добра прамыйце і выкладзіце ў таўстасценную каструлю, заліце трыма шклянкамі вады. Пастаўце ў разагрэтую духоўку на 2-3 гадзіны. Пшаніца павінна цалкам разварыцца, зярняткі стануць мяккімі. Астудзіце ў каструлі. Тым часам нарэжце сухафрукты і арэхі, мак разатрыце ў ступцы да атрымання аднастайнай масы (макавае малачко). Змяшайце ўсе інгрэдыенты і паліце мядовай сытай (мёд развядзіце ў прапорцыі 1:1 з вадой і закіпяціце).

### КУЦЦЯ З РЫСУ

**Спатрэбіцца:** ***1 шклянка рысу, 1,5 ст.л. мёду, 100 г разынак, 100 г кургі, 100 г міндалю, 100 г фундуку, 2-2,5 шклянкі апельсінавага соку.***



Зварыце рыс на апельсінавым соку. Падрыхтаваныя арэхі і сухафрукты нарэжце і змяшайце з рысам. Упрыгожце буйнымі кавалачкамі курагі.

### КАЧКА Ў СОУСЕ З ЧАРНАСЛІВУ

**Спатрэбіцца:** ***1 сярэдняя качка (каля 2 кг), 400 г чарнасліву без костачак, 3 кісла-салодкія яблыкі, 1 ст.л. мёду, 1 ст.л. сухога чабору, 6 ст.л. чырвонага сухога віна, 1 ст.л. крухмалу, соль, чорны молаты перац — на смак.***

Старанна падрыхтуйце тушку. Прыгатуйце начынку: ачысціце яблыкі ад лупіны і зярнят, нарэжце іх тонкімі скрылікамі, злучыце з 300 г распаранага і абсушанага чарнасліву і дадайце чабор. Укладзіце атрыманую сумесь у брушка качкі і зашыйце яго суровай ніткай або закаліце зубачысткамі. Пакладзіце качку на спінку, накаліце ўсю паверхню нажом, робячы даволі частыя надрэзы. Натрыце качку соллю і перцам і змажце мёдам.

У разагрэтую да 180-190 ° С духоўку пастаўце бляху з качкай і запякайце прыкладна 1,5 гадзіны. Не забывайце паліваць качку сокам, які ўтвараецца, прыкладна раз у 10 хвілін. Для падліўкі замачыце пакінуты чарнасліў у кіпені прыкладна на паўгадзіны, абсушыце і дробна нарэжце. У каструльку наліце віно, пастаўце на слабы агонь. Тым часам размяшайце крухмал у 2 ст.л. вады і дадайце да віна. Размяшайце і ўсыпце чарнасліў. На мінімальным агні праварыце соус на працягу 5-7 хвілін, увесь час памешваючы. Затым працярыце праз сіта або здрабніце ў блендары і пакіньце ў каструльцы, ахінуўшы яе.

Падавайце качку, нарэзаўшы яе на парцыённыя кавалкі, абклаўшы яблычна-чарнаслівавым «фаршам» і дадаўшы падліўку. У якасці гарніру — свежыя гароднiна і бульбяное пюрэ.

-2904-

## СМАЧНЫЯ ПАДАРУНКІ



**Гэта могуць быць самаробныя цукеркі, арэхі ў цукровай глазуры, шакалад або мармелад у прыгожай упакоўцы ці больш карысныя ягады і садавіна ў шакаладзе.**

Для прыгатавання хатніх цукерак вам спатрэбіцца 150 г міндалю, 100 г цукровай пудры, 1 ст.л. лімоннага соку, 1 яечны бялок і шакалад, арэхі, глазура або какава для ўпрыгожвання.

Ачысціце міндаль, папярэдне заліўшы яго кіпенем. Высушыце і высушаны міндаль здрабніце ў блендары або патаўчыце, дадайце сок лімона, цукровую пудру і бялок. Старанна змяшайце. У вас павінна атрымацца сумесь, з якой будуць добра ляпіцца цукеркі. Скатайце з арэхавай масы шарыкі і ўпрыгожце іх з дапамогай шакаладу або глазуры.

У якасці ўпакоўкі можна выкарыстоўваць празрыстую пакавальную плёнку для кветак і тасьму яркага колеру.

-2905-

## МАБІЛЬНЫЯ ВІНШАВАННІ

**Беларусы ў навагоднюю ноч адправілі больш за 22 млн SMS і зрабілі каля 14 млн званкоў, паведамілі БЕЛТА ў прадстаўніцтвах сотавых аператараў.**

Больш за ўсё званкоў з 21.00 31 снежня да 2.00 1 студзеня зрабілі абаненты МТС — каля 7,2 млн. Абаненты velcom зрабілі ў навагоднюю ноч 5,4 млн званкоў. Найбольшую колькасць SMS адправілі карыстальнікі velcom — каля 11,3 млн, абаненты МТС — 9,2 млн. Аператар life:) яшчэ не падвёў вынікі навагодняй ночы. Зыходзячы з кліенцкай базы кампаніі, абаненты аператара, як мяркуецца, зрабілі 1-1,5 млн званкоў і адправілі больш за 2 млн паведамленняў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Маладая сям'я адзначае Новы год. Адзін з гасцей пытаецца:**
**— А хто ў вас дома гаспадар?**
**Жонка:**
**— Гаспадар, падай голас!**
**Муж (жаласна):**
**— Гаў!**

У нас з сябрамі ёсць традыцыя: кожны год 31 снежня мы ходзім... А вось 1 студзеня ўжо не...




**Муж — жонцы:**
**— Ты ж абяцала пасля шасці не есці, што робіш у халадзільніку?**
**— Перастаноўку.**

Двое сяброў.
— А мне мая заявіла, што да вяселля «ні-ні»!
— А ты ёй што?
— А я ёй — «ну-ну»...

У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 9 студзеня г.г.



Шаноўную **Святлану Яўгенаўну ЯФІМЕНКА**, добразычлівую, спагадлівую, энергічную і жыццярадасную жанчыну, галоўнага ўрача 17 дзіцячай паліклінікі г. Мінска, віншуем **з юбілеем.**

*Натхнення зычым мы і творчага ўзлёту,*
*Дзён сонечных і зорных вечароў,*
*Здароўя моцнага, душы палёту,*
*Удзячных пацыентаў зноў і зноў.*

*Не ведаць стомленасці, быць патрэбнай*
*На працы, і ў сям'і, і сваякам.*
*Зззяць, як высокай пробы срэбра*
*І непадуладнай быць сваім гадам.*

**З павагай, Тарасевічы, Дуда, Каляда.**



Сардэчна віншуем з **80-годдзем** і **Нараджэннем Хрыстовым** дарагога бацьку і дзядулю **Генадзя Юстынавіча КРУЛІКОЎСКАГА** з в. Зацішак Валожынскага раёна.

*Жадаем мы радасці, светлай надзеі,*
*Спакою і шчасця ў будні і святы.*
*Хай добрыя весткі*
*прыходзяць у хату.*
*Жадаем яшчэ мы здароўя і сілы,*
*Жыццё няхай будзе доўгім, шчаслівым.*

**З любоўю і павагай дзеці Мікалай і Наталля, іх сем'і, унукі і праўнукі.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.27 | 17.03 | 7.36 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.46 | 7.22 |
| Магілёў — | 9.17 | 16.53 | 7.36 |
| Гомель — | 9.06 | 16.58 | 7.52 |
| Гродна — | 9.41 | 17.20 | 7.39 |
| Брэст — | 9.33 | 17.29 | 7.56 |

**Месяц**

***Апошняя квадра ў 5.59. Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Васіля, Івана, Паўла.*
***К.*** *Ганны, Дзіяны, Шымана, Эдуарда, Эміліяны, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**1907** год — нарадзіўся (вёска Радучы, зараз Чавускі раён) Кастусь Губарэвіч, беларускі драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў. Аўтар п'ес «Цэнтральны ход», «Алазанская даліна», драм «Цытадэль славы», «Галоўная стаўка», «Брэсцкі мір» і іншых. Па яго сцэнарыях пастаўлены фільмы «Дзяўчынка шукае бацьку», «Анюціна дарога», «Паланэз Агінскага». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Ленінскага камсамола Беларусі. Памёр у 1987 г.



**1876** год — нарадзіўся Конрад Адэнаўэр. Пасля першага арышту ён пайшоў у манастыр бенедыктынцаў, пасля другога — здзейсніў дзёрзкія ўцёкі з канцэнтрацыйнага лагера. З засценкаў гестапа яго вызвалілі саюзнікі. Такія некаторыя «вехі баявой біяграфіі» хрысціянскага дэмакрата, «бацькі аб'яднанай Еўропы» Конрада Адэнаўэра. У 73 гады, з перавагай усяго ў адзін голас, ён стаў першым федэральным канцлерам Федэратыўнай Рэспублікі Германіі і займаў гэты пост 4 тэрміны. Усе наступныя выбары заканчваліся поўным трыумфам Адэнаўэра. Немцы абагаўлялі яго, але не даравалі Берлінскай сцэны, узвядзенню якой ён працівіцца не змог... У адстаўку Адэнаўэр сышоў у 86 гадоў.

**1931** год — нарадзіўся (вёска Слабада Мазырскага раёна) Уладзімір Антонавіч Піліповіч, беларускі фізік, акадэмік НАН Беларусі (1980), доктар фізіка-матэматычных навук (1972), прафесар (1977), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1978). Аўтар каля 400 навуковых прац. Даследаваў цвёрдацельныя аптычныя квантавыя генератары, актыўныя і пасіўныя імпульсныя мадулятары дабротнасці рэзанатараў, узаемадзеянне магутнага выпраменьвання з кандэнсаваным асяроддзем; прапанаваў метады вызначэння страт выпраменьвання ў працэсе генерацыі. Распрацаваў галаграфічнае запамінальнае ўстройства, элементы і прыстасаванні для аптычных метадаў апрацоўкі інфармацыі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1981), медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1985) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996).

**Было сказана**

**Максім Багдановіч (1891—1917), паэт, перакладчык, публіцыст:**

***«Кожны інтэлігент павінен адпавядаць наступным двум патрабаванням: па-першае, ён мусіць мець памкненне да ведаў, па-другое, ён мусіць імкнуцца несці свае веды на карысць грамадству».***


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.122. Індэкс 63850. Зак. № 71.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 студзеня 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12